

ЯК ДАЛУЧЫЦЬ ДЗЯЦЕЙ ДА ЧЫТАННЯ? 11




«ПЕСНІ ПРА ЗУБРА» — 500 ГАДОЎ 13


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЛЮТАГА 2023 г. АЎТОРАК № 24 (29904)


## КОРАТКА

- Амаль 41 тысячы іншаземцаў з пачатку года наведалі Беларусь па бязвізе.
- Беларускі велагоншчык Дайніс Брыцыс выйграў «серабро» на турніры ў Краснадарскім краі.
- Беларусь дапаможа Зімбабвэ палепшыць работу аховы здароўя ў сферы мацярынства і дзяцінства.
- Батлейку і падарожжа па экспазіцыях рыхтуе музей Масленікава ў Магілёве.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«У краіне актыўна рэалізуюцца праграмы імпартазамяшчэння. Асноўныя кірункі — гэта лакалізацыя прадукцыі, інтэграцыйныя праекты, кааперацыя малога і сярэдняга бізнесу з буйнымі дзяржпрадпрыемствамі. Прытым да гэтага часу паўнацэнна не запрацавала сістэма падтрымкі прадпрыемстваў, якія выпускаюць імпартазамяшчальную прадукцыю. Урадам падрыхтаваны шэраг інструментаў для стымулявання нашых вытворцаў, але не ўсе імі карыстаюцца. Неабходна даваць прэферэнцыі той прадукцыі, у якой максімальная лакалізацыя на тэрыторыі нашай краіны. Яна дае вялікую дабаўленую вартасць, новыя рабочыя месцы, папаўняе бюджэт. Таму вельмі важна падтрымаць гэтыя тавары, асабліва на першапачатковым этапе іх вытворчасці, каб яны змаглі вытрымаць канкурэнцыю на рынку».*


ISSN 1990 — 763X


З першых вуснаў

# «ГЭТА НАША ДОБРАЯ ВОЛЯ, МЫ ЯЕ ПРАДЭМАНСТРАВАЛІ»

### Прэзідэнт падпісаў указ аб стварэнні камісіі для работы з ахвотнымі вярнуцца на Радзіму

**Рабочы тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пачаўся з даклада Генеральнага пракурора Андрэя Шведа. Кіраўнік дзяржавы адразу даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта і пракуратуры падрыхтаваць нараду з сілавым блокам краіны, каб абмеркаваць вынікі мінулага года і задачы, якія стаяць сёння.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт таксама абазначыў асноўныя пытанні, якія цікавілі яго ў дакладзе Генеральнага пракурора. Адно з іх — ацэнка пракуратурай крымінагеннай абстаноўкі ў краіне. Другое пытанне — расследаванне крымінальнай справы па факце генацыду насельніцтва Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Крымінальны працэс быў распачаты Генпракуратурай у красавіку 2021 года. «Акрамя вас, пракуратуры, ніхто не займаецца. Бачу, што вы актыўныя, малайцы, гэта вельмі патрэбна. І гэта застанецца ў гісторыі назаўжды», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

### «Нікога цягнуць сюды не трэба»

Кіраўнік дзяржавы расказаў таксама, што падпісаў указ аб стварэнні камісіі для работы з тымі, хто хоча вярнуцца на Радзіму. Ён назваў гэта пытанне адным з найважнейшых. «Гэта якраз тое пытанне, якое мы абмяркавалі напярэдадні. Я паглядзеў і склад камісіі, і іншае. Калі мы нешта ва ўказе не прадугледзелі, дастаткова ўлады ў Генеральнага пракурора для таго, каб задзейнічаць увесь дзяржаўны апарат, дзяржслужачых, для таго каб вырашыць гэтую праблему з тымі збеглымі. Трэба глядзець не толькі збеглых — хтосьці з-пад плінтуса вылезе. Яны ж разумеюць, што мы іх усё роўна знойдзем. Хтосьці звернецца ў камісію, а вы ў камісіі ўжо разберацеся», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, правільна зрабілі, што ў склад камісіі ўключылі людзей, якія ў 2020 годзе пацярпелі, супраць якіх здзяйсняліся ці былі спробы здзяйснення тэрарыстычных актаў і гэтак далей. «Грамадства будзе разумець, што рашэнне прымае не Лукашэнка, ці Швед, ці нейкія іншыя людзі, надзеленыя ўладай. Натуральна, мы гэта павінны арганізаваць і быць галоўнымі дзеючымі асобамі. Але і тыя, хто бачыў, што адбывалася, і пацярпелі, і супраць іх здзяйсняліся нейкія акты гвалту ці правапарушэнні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён папрасіў яшчэ раз дэталёвым чынам людзям растлумачыць, у чым сутнасць гэтай работы.

«Другое, што трэба падкрэсліць. Я назіраў за СМІ апошні тыдзень, там шум падняўся, асабліва ў штабах ціхушкі-лахушкі ў Літве, Польшчы ашалелі. Я хачу вам яшчэ раз сказаць і людзі каб разумелі. Яны там зараз на безграшоўі сядзяць. Захад будзе фінансаваць толькі канкрэтныя мерапрыемствы, пажадана радыкальнага плана і нават ужо не ўзроўню 2020 года, а звярэжнне, забойства прэзідэнта, службовых асоб. Усіх, хто ўпоперак горла стаў, — усіх прыбраць. Гэта будзе фінансаваць Захад», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. «Ім задаюць пытанні «хто вы такія, ціхушкі-лахушкі, хто за вамі стаіць. Ну, вось яны крычаць, што «мільён з Беларусі ўцяклі, што яны ў Польшчы, Літве і Украіне як гіены стаяць па перыметры і ляскаюць зубамі». Ніякіх там мільёнаў няма, хтосьці называе дзве тысячы, хтосьці — да чатырох тысяч — усё роўна колькі.


СТАР. 2


Энергетыка

# Бяспека «сэрца» БелАЭС

### Беларусь рыхтуецца да запуску другога энергаблока і думае пра трэці

**Пачаць работы па вывадзе другога энергаблока БелАЭС на мінімальна кантралюемы ўзровень, іншымі словамі, запусціць ланцуговую рэакцыю, з дня на дзень плануюць айчынныя энергетыкі. Пасля серыі выпрабаванняў, калі не будзе выяўлена ніякіх момантаў, што запатрабуюць дарэгуліровак, у сакавіку-красавіку адбудзецца першае падключэнне энергаблока да сеткі, а ў другім паўгоддзі — яго ўвод у эксплуатацыю. Першы энергаблок, між іншым, выпрацаваў ужо 11,7 млд кВт·г, што дазволіла замясціць 3,3 млрд кубаметраў газу. З уводам другога АЭС будзе выпрацоўваць каля 18,5 млрд кВт·г, што дазволіць забяспечыць да 40 % патрэб краіны ў электраэнергіі. Як цяпер працуе атамная станцыя, што робіцца ў яе майстэрнях і як падрыхтаваны энергетыкі да пуску другога рэактара, эксперты расказалі журналістам падчас наведвання імі АЭС.**


СТАР. 6





Па сутнасці справы

# Дарогі як крытэрый дабрабыту

**У канцы студзеня на нарадзе аб грамадска-палітычнай абстаноўцы і стане злачыннасці ў краіне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на дрэнную якасць дарог у сталіцы і патрабаваў ад адказных асоб аператыўна вырашыць гэту праблему. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дарогі і ўсё, што з імі звязана, як у Мінску, так і ў іншых гарадах і населеных пунктах — усюды — павінны быць у парадку.**

У Беларусі ў 2023 годзе адрамантуюць каля адной тысячы кіламетраў рэспубліканскіх і паўтары тысячы мясцовых дарог, паведамляе БелТА са спасылкай на міністра транспарту і камунікацый Аляксея Аўраменку. Каля 685 мільёнаў рублёў плануецца выдаткаваць з бюджэту сёлета на рамонт дарожнага пакрыцця. Па словах міністра, цяпер на рэспубліканскіх і мясцовых дарогах штодзень працуе каля 250 брыгад, якія займаюцца ямачным рамонтам, з 1 студзеня ўжо праведзена 60 тысяч квадратных метраў ямачнага рамонту.

Па словах **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Рыгора ГЛАЗКО,** асноўнымі аб'ектамі, якім будзе ўдзелена ўвага сёлета, стануць паўднёва-заходні абход Магілёва працягласцю 11,5 кіламетра. Будуць пачаты работы па рэканструкцыі дарогі Р46 Лепель — Полацк — граніца Расійскай Федэрацыі, даўжыня якой складае 61,5 кіламетра. Акрамя таго, прадоўжыцца рэканструкцыя аўтамабільнай дарогі Р53 на ўчастку ад Смалявіч да Жодзіна працягласцю 14 кіламетраў. Прадоўжацца работы па дарогах Р99 і М1. На высокай стадыі прапрацоўкі знаходзіцца пытанне рэканструкцыі ўчастка М3 ад Лагойска да Плешчаніц, даўжыня якога складае 15 кіламетраў. Акрамя таго, прапрацоўваецца пытанне па далейшай рэканструкцыі Р122 працягласцю 31 кіламетр. «Гэта асноўныя аб'екты аўтамабільных дарог, якія будуць адрамантаваны або рэканструяваны», — расказаў Рыгор Глазко ў праекце БелТА «Краіна гаворыць».


СТАР. 4–5

# «ГЭТА НАША ДОБРАЯ ВОЛЯ, МЫ ЯЕ ПРАДЭМАНСТРАВАЛІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але яны гэтым пацвярджаюць сваю рашучасць і магчымасць тут нешта здзейсніць аж да сур'ёзных тэрактаў ціхушкі-лахушкі. І калі Захад бачыць, што за імі хтосьці стаіць, хоць невялікая група людзей, столькі і грошай дадуць на існаванне. І яны баяцца, што частка гэтых людзей, а крый божа, большасць, з'едзе ў Беларусь і звернецца ў гэту камісію. Тады і грошай няма, таму што за імі, за гэтымі офісамі, ніхто не стаіць», — дадаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, некатарым украінцы прапаноўваюць ісці на фронт ваяваць супраць Расіі: «Усе яны крычалі «полк Каліноўскага» і іншае, а там каля 100 чалавек у гэтым так званым палку. Вось яны бегаюць, некаторыя вялікія палкоўнікі і падпалкоўнікі крычаць: «Мы ствараем народна-вызваленчую армію». У гэтай арміі ўсяго сотня чалавек, і тыя ваююць пад Бахмутам, Арцёмаўскам. І гіне нямала людзей. Яшчэ раз паўтараю: есці хочацца. Але ёсць і азвярэлыя, якія гатовы змагацца там супраць Расіі і тут прыйсці змагацца да канца супраць беларускага народа. Ну, гэта іх выбар. Я гэта дзеля чаго кажу. Мы нікога не павінны сюды цягнуць. Вось пачытаюць указ і будуць бачыць, як будзе працаваць камісія», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Падыходы вызначаны

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ў Беларусі апрыёры нікога не збіраюцца пазбаўляць волі. А тыя, хто парушыў закон, і сам у гэтую камісію не звернецца. «Пойдзе — разгледзім. Усё будзе па законе. Але галоўнае — не цягнуць іх сюды сілай. Вы правільна прапанавалі: заяву ў камісію хочаце па інтэрнэце перадавайце, хочаце ў канверце дасылайце, мы разгледзім любую вашу заяву. Але сілай сюды цягнуць, каб пасадзіць, мы не збіраемся. Гэта наша добрая воля, мы яе прадэманстравалі, калі ласка, звяртайцеся, будзем разглядаць вашую заяву. Не хочаце — сядзіце там. Хочаце — ваюйце. Не ўсе ж могуць ваяваць, не ўсіх возьмуць на фронт — мяцліце вуліцу, мыйце посуд. Хто больш падрыхтаваны, будуць патроны падаваць у Польшчы ці Літве. Гэта іх выбар. Мы нікога не прымушаем і не настойваем. Вось гэта галоўнае ў рабоце камісіі», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што пры неабходнасці трэба падключаць і Прэзідэнта. Тым больш што некаторыя могуць пайсці праз памілаванне Прэзідэнта.

«Вось гэта комплекс пытанняў, які цяпер трэба закруціць. Сумесна з вялікай работай па генацыдзе. Пракуратуру зверху данізу давядзецца, вядома, дагрузіць, і загрузіцца гэтымі пытаннямі: разгляду скаргаў і заяў нашых збеглых і тут якія здзейснілі правапарушэнні. Гэтае пытанне неяк трэба здымаць у грамадстве. Патрэбна развязка», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Андрэй Швед падзякаваў Прэзідэнту за падтрымку прапаноў, якія былі рэалізаваны ва ўказе. «Гэта сапраўды была работа ўсіх дзяржаўных органаў. Падыходы былі ў асноўным вызначаны, як вы і абазначылі, з тым, каб сюды нікога не цягнуць, а людзі разумелі, што маюць у тым ліку і гарантыі», — сказаў Генпракурор.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Што прадугледжвае ўказ?

У прэс-службе Прэзідэнта патлумачылі асноўныя палажэнні Указа № 25 «Аб разглядзе зваротаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца за мяжой, па пытаннях учынення імі правапарушэнняў».

* Указам прадугледжваецца ўтварэнне камісіі, упаўнаважанай на разгляд адпаведных зваротаў. У яе склад уключаны кіраўнікі дзяржаўных органаў, парламентарыі і прадстаўнікі грамадскіх структур. Старшынёй будзе генеральны пракурор Беларусі.

* У камісію маюць права звярнуцца ахвотныя вярнуцца на Радзіму грамадзяне Беларусі, якія ўчынілі ў перыяд з 1 студзеня 2020 года да ўступлення ў сілу гэтага ўказа адміністрацыйныя правапарушэнні або злачынствы пратэснай накіраванасці, асцерагаюцца вяртання ў краіну ў сувязі са сваім магчымым дачыненнем да ўчынення такіх правапарушэнняў, злачынстваў.

* Адпаведныя звароты могуць быць накіраваны грамадзянамі ў тэрмін да 31 снежня 2023 года ў пісьмовай ці электроннай форме з дадаткам неабходных дакументаў.

* Пры гэтым асобы павінны раскаяцца ў зробленым і праінфармаваць камісію аб гатоўнасці пасля вяртання прынесці публічныя прабачэнні, кампенсаваць прычыненую шкоду, выконваць Канстытуцыю і заканадаўства Беларусі, паважаць дзяржаўныя сімвалы і нацыянальныя традыцыі, свядома і актыўна выконваць свой грамадзянскі абавязак.

* Па выніках разгляду зваротаў грамадзяне будуць паведамляць аб наяўнасці або адсутнасці ў адносінах да іх адміністрацыйнага працэсу, узбуджанай крымінальнай справы, а таксама аб магчымасці іх спынення ў парадку і на ўмовах, устаноўленых заканадаўствам. Гэтыя рашэнні будуць прымацца камісіяй шляхам адкрытага галасавання большасцю галасоў і афармляцца пратаколамі.

* Пасля гэтага грамадзяне абавязаны прыбыць у краіну не пазней за тры месяцы з даты накіравання камісіяй адпаведнага паведамлення. Пры невыкананні гэтага патрабавання рашэнне камісіі страчвае сілу.

* Адначасова ўказам прадугледжваецца гарантыя аб тым, што прыняцце любых працэсуальных рашэнняў адносна грамадзян, якія прыбылі, магчыма выключна са згоды генеральнага пракурора або асобы, якая выконвае яго абавязкі.

## У тэму

### «Мы нікога не прымушаем»

Пасля даклада ў Прэзідэнта Генеральны пракурор сустрэўся з журналістамі.

«Я хачу падкрэсліць, і гэта вельмі важна: мы нікога не прымушаем. Гэта добрая воля нашай дзяржавы», — падкрэсліў Андрэй Швед. Па яго словах, тая інфармацыя, якая сёння з'яўляецца за мяжой па гэтай тэме, не што іншае, як запалохванне людзей. «Гэта звязана з тым, што для іх нашы грамадзяне — усяго толькі сродкі зараблення грошай. Кожны павінен думаць аб сабе, аб сваіх родных і блізкіх. Думайце, узважвайце, чытайце, усё адкрыта і зразумела», — падкрэсліў генпракурор. Ён адзначыў, што да кожнага заяўніка будзе індывідуальны падыход. Ва ўказе вызначаны віды рашэння камісіі. «Калі мы прыходзім да высновы, што чалавек памыліўся, паддаўся эмоцыям, уплыву (бо мы добра памятаем, якое было інфармацыйнае прапампоўванне, інфармацыйны ціск), але цяпер шчыра раскайваецца, мы рэкамендуем праваахоўным органам прыняць працэсуальнае рашэнне аб спыненні крымінальнага пераследу. І пра гэта пішам чалавеку: «Так, у дачыненні да вас мелася крымінальнае судаводства, прынятае такое рашэнне, і вы маеце права спакойна ўехаць, ніякіх прэтэнзій да вас няма». Калі толькі вы нешта не схавалі. Калі чалавек здзейсніў яшчэ нейкае злачынства і пра гэта нікому невядома (ён хавае), закон для ўсіх аднолькавы», — растлумачыў Андрэй Швед. У склад камісіі ўвайшлі каля 30 чалавек. Збіраецца яна будзе па меры неабходнасці. Максімум да двух месяцаў будзе разглядацца заява. У выключных выпадках да трох месяцаў. Гэта нармальны прамежак часу, за які можна падрыхтавацца і вывучыць матэрыялы па кожным канкрэтным прыкладзе.

# «Незалежнасць судовай сістэмы ўзмацняецца»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са Старшынёй Вярхоўнага Суда Валянцінам Сукалам. Кіраўнік дзяржавы цікавіўся развіццём судовай сістэмы ў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся меркаваннем Валянціна Сукалы наконт работы з тымі, хто жадае вярнуцца на Радзіму.**

Прэзідэнт звярнуў увагу, што сёлета адзначаецца 100-годдзе Вярхоўнага Суда Беларусі. Ён нагадаў, што калісьці «замахнуліся» на чарговую рэформу судовай сістэмы. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся яе вынікамі. «Падыходзім да Усебеларускага народнага сходу. Суды выведзены наверх, калі так казаць па-народнаму, пад УНС. Незалежнасць судовай сістэмы такім чынам узмацняецца», — адзначыў беларускі лідар. Таксама ён спытаў, ці не былі тут допушчаны тыя ці іншыя памылкі. Па яго словах, гэта вельмі важна, асабліва, улічваючы, што суд падымаецца да Усебеларускага народнага сходу.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як у Вярхоўным Судзе развіваецца інстытут апеляцыі, улічваючы вопыт эканамічных судоў. Працягнулася тэма і даклада Генеральнага пракурора — работа з грамадзянамі, якія хочуць вярнуцца на Радзіму. «Па законе мы прымаем у судах шмат рашэнняў па пакаранні тых, хто ўчыніў адпаведныя злачынствы. Па людзях, якія знаходзяцца тут. Як гэта стыкуецца, ці няма тут супярэчнасцяў?» — пацікавіўся Прэзідэнт. Ён таксама звярнуў увагу на судовыя разборы спраў, якія знаходзяцца ў яго на кантролі.

Валянцін Сукала падкрэсліў, што судовая сістэма ў цэлым адпавядае ўсім канстытуцыйным патрабаванням, якія да яе прад'яўляюць. «Яна спакойна рэагуе на ўсе выклікі і пагрозы, асвойвае тыя аб'ёмы правасуддзя, якія сёння ў яе ёсць. Разам з тым яна не стаіць на месцы, працягвае ўдасканальвацца, рэфармавацца. Першыя вынікі праведзенай рэформы ўжо відавочныя. Так удала супала, што судовая рэформа па часе супала з канстытуцыйнай. Мы завяршылі трэці этап судовай рэформы, і якраз падаспела канстытуцыйная рэформа. І гэта атрымала замацаванне на самым высокім канстытуцыйным узроўні», — сказаў Старшыня Вярхоўнага Суда.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### Якасць правасуддзя паляпшаецца

Валянцін Сукала расказаў журналістам, што па выніках судовай рэформы, у першую чаргу, палепшылася арганізацыя работы судоў. «Калі мы ўвялі аўдыязапіс судовых пасяджэнняў (а зараз будзем весці і відэазапіс), судовыя працэсы сталі зусім іншымі: менш канфліктнымі, больш строгімі. Яны больш дакладна адпавядаюць закону. Удзельнікі працэсу сябе стрымліваюць. Практычна не стала скаргаў на паводзіны суддзяў, на парушэнне правілаў судовага працэсу. Гэта зрабіла правасуддзе і публічным, і ў той жа час больш прымірэнчым», — адзначыў ён. На карысць пайшла і лічбавізацыя судовай сістэмы. Гэта дало магчымасць кантраляваць з Мінска арганізацыю работы кожнага раённага суда. «І мы адразу бачым эфектыўнасць работы кожнага суда за нейкі перыяд, нават за адзін дзень. Мы практычна на 40 % скарацілі колькасць адкладаў, перапынкаў, пераносу судовых пасяджэнняў. Гэта значыць, правасуддзе стала больш эканамічным, аператыўным, сучасным», — заявіў Валянцін Сукала. Па першых выніках судовай рэформы больш як удвая скарацілася колькасць абгрунтаваных скаргаў на арганізацыю работы судоў.

«Можа быць, крыху павольней, чым хацелася б, паляпшаецца якасць правасуддзя, але тут гэта звязана з укараненнем новых форм судаводства, гэта значыць, пераходам на апеляцыю, увядзеннем дадатковай стадыі судовай касацыі. Гэта патрабуе, канешне, яшчэ адаптацыі. Але на шляху да гэтага ўжо сур'ёзна паляпшаецца якасць работы апеляцыйных інстанцый. Гэта значыць, сёння апеляцыйныя інстанцыі, не вяртаючы справу на новы судовы разгляд, самі фактычна завяршаюць правасуддзе, выносяць рашэнне, — растлумачыў Валянцін Сукала, заўважыўшы, што гэта паскарае працэс правасуддзя, робіць яго больш сучасным, зразумелым і эканамічным. Але ён падкрэсліў, што не ўсе недахопы пакуль удалося ўстараніць.

Кажучы аб рабоце з тымі, хто хоча вярнуцца на Радзіму, Валянцін Сукала падкрэсліў, што крыху ўзрасло паступленне крымінальных спраў экстрэмісцкай накіраванасці. «Мы, суды, у першую чаргу зацікаўлены, каб такіх спраў было ўсё ж такі менш. Калі нейкая частка з іх не будзе даходзіць да суда, а будзе спыняцца на дасудовай стадыі, думаю, гэта можна толькі вітаць. Вядома, калі гэтыя людзі раскаяліся ў зробленым, пакрылі шкоду, папрасілі прабачэння», — адзначыў ён.

# ЛЮТЫ. ЧАС «ВЯЛІКАЙ РАЗМОВЫ»

**У лютым у Беларусі адбудзецца ўжо традыцыйнае мерапрыемства «Вялікая размова з Прэзідэнтам», у ходзе якой кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў прамым эфіры будзе размаўляць з журналістамі, блогерамі і прадстаўнікамі грамадскасці. Аб гэтым у інтэрв'ю СМІ расказала прэс-сакратар беларускага лідара Наталля Эйсмант.**

«Журналістаў і вашых калег больш за ўсё цікавіць магчымасць самім асабіста паразмаўляць з кіраўніком дзяржавы. Хачу праанансаваць: у лютым у нас запланавана «Вялікая размова з Прэзідэнтам». Яна, як звычайна, пройдзе ў шырокім складзе. Мы запрашаем нашых журналістаў, блогераў, актывістаў да максімальна адкрытай размовы з Прэзідэнтам у прамым эфіры», — сказала прэс-сакратар.

Яна адзначыла, што спецыяльна была зроблена паўза паўтара года. Папярэдняе такое мерапрыемства адбылося 9 жніўня 2021 года. «Нам вельмі важна было пасля няпростага, але ндзённага 2022 года даць магчымасць журналістам разам з Прэзідэнтам падвесці яго вынікі. Цяпер ужо, пасля заканчэння студзеня, мы маем усю статыстыку. І гэта размова, думаю, шмат у чым будзе прысвечана вынікам 2022 года. Але не толькі. Як звычайна, Прэзідэнт будзе максімальна адкрыты і адкажа на ўсе пытанні журналістаў», — анансавала Наталля Эйсмант.

# КУЛЬТУРНА ПРАБЕГЛІ!

**На Мінскай гарадской лыжаролернай трасе ў мікраpаёне «Вяснянка» прайшла зімовая Рэспубліканская спартакіяда работнікаў культуры «Культурная лыжня 2023». На старт выйшлі 36 каманд работнікаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, сярод іх былі каманды ўстаноў культуры, устаноў адукацыі ў сферы культуры, а таксама каманды работнікаў рэгіянальных устаноў культуры з усіх абласцей Беларусі.**



Спаборніцтвы пачаліся з лыжнай эстафеты каманд у складзе двух мужчын і дзвюх жанчын. У эстафеце не было роўных камандзе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, на заключным этапе першым фінішаваў міністр культуры Анатоль Маркевіч.

Другое месца заняла каманда аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Гродзенскай вобласці. Тройку прызёраў замкнула каманда Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

На старт лыжнай эстафеты «Дружная сям'я» выйшлі пяць каманд, у кожнай з якіх было па тры ўдзельнікі: мама, тата і дзіця да 14 гадоў. Першае месца па праве дасталася сям'і Ражкоўскіх, якая прадстаўляла Белдзяржфілармонію.

Па заканчэнні спартыўных спаборніцтваў старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Тацццяна Філімонава ўручыла кубкі, медалі і каштоўныя падарункі пераможцам спартакіяды, а артысты групы «Чараўніцы» і майстэрні эстраднага мастацтва «Хвілінка» завяршылі цырымонію ўзнагароджання вакальнымі і танцавальнымі нумарамі.

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**

Класныя навіны

# НОВЫЯ НЮАНСЫ Ў АТЭСТАЦЫІ ВЫПУСКНІКОЎ

## Апошнія званкі празвіняць 25 мая, а выпускныя вечары адшумяць 10 чэрвеня

**Міністэрства адукацыі размясціла на сваім сайце рэкамендацыі аб завяршэнні вучэбных заняткаў і заканчэнні 2022/2023 навучальнага года. Пільная ўвага — асаблівасцям арганізацыі адукацыйнага працэсу ў другім паўгоддзі для навучэнцаў выпускных класаў, якія напрыканцы мая ўпершыню будуць здаваць цэнтралізаваныя экзамены.**

Так, засваенне зместу вучэбных праграм для вучняў 11 класаў па беларускай і рускай мовах павінна завяршыцца 12 мая, па вучэбных прадметах, якія школьнікі выбралі для здачы ў якасці другога цэнтралізаванага экзамену, — 19 мая.

Пры неабходнасці ў IV чвэрці ў расклад вучэбных заняткаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура», «Руская мова» і «Руская літаратура» могуць быць унесены змены: да 12 мая ўрокі літаратуры могуць быць заменены ўрокамі мовы, а пасля 14 мая ўрокі мовы — адпаведна ўрокамі літаратуры.

У Міністэрстве адукацыі падкрэсліваюць, што навучальныя праграмы па прадметах для 9 і 11 класаў складзены так, што асноўны навучальны матэрыял можа быць засвоены вучнямі на працягу 34 навучальных тыдняў. Настаўнік мае права пераразмяркоўваць колькасць гадзін на вывучэнне тэм у межах агульнай колькасці гадзін, адведзеных на вучэбны прадмет, выкарыстоўваючы педагагічна мэтазгодныя метады навучання і выхавання, разнастайныя формы правядзення вучэбных заняткаў.

Атэстацыя адзінаццацікласнікаў па прадметах «Беларуская мова» і «Руская мова» па выніках навучальнага года праводзіцца да 12 мая. Атэстацыя выпускнікоў, якія па сваім выбары здаюць на ЦЭ "Замежную мову" , «Матэматыку», «Сусветную гісторыю», «Гісторыю Беларусі», «Грамадазнаўства», «Геаграфію», «Біялогію», «Фізіку», «Хімію», — да 19 мая. Атэстацыя адзінаццацікласнікаў па вучэбных прадметах, па якіх яны не здавалі цэнтралізаваны экзамен, а таксама па іншых вучэбных прадметах, па якіх не прадугледжаны выніковыя экзамены на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, праводзіцца да 25 мая.

Цэнтралізаваныя экзамены для выпускнікоў пройдуць 14 і 21 мая, але вучэбны працэс у школе не спыняецца. З 22 да 25 мая ў адзінаццатых класах будуць праводзіцца вучэбныя заняткі па ўсіх вучэбных прадметах у адпаведнасці з іх раскладам. Па вучэбных прадметах, па якіх навучэнцы здалі ЦЭ, рэкамендуецца правесці ўрокі сістэматызацыі і абагульнення, урокі-практыкумы. Апошнія званкі для адзінаццацікласнікаў празвіняць 25 мая. Выпускныя вечары для іх рэкамендавана правесці 10 чэрвеня.

З 26 мая да 9 чэрвеня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі раяць арганізаваць кансультацыі па падрыхтоўцы выпускнікоў да цэнтралізаванага тэсціравання.

Навучальныя заняткі для вучняў 9 і 11 класаў завяршаюцца 25 мая, а для ўсіх іншых школьнікаў навучальны завяршаецца 31 мая.

Выпускныя экзамены для дзевяцікласнікаў пройдуць з 1 да 9 чэрвеня. Выпускнікі базавай школы пішуць пераклад па беларускай і рускай мове, кантрольную работу па матэматыцы і здаюць вусны экзамен па гісторыі Беларусі. Другое пытанне ў білеце прадугледжвае выкананне практычнага задання, накіраванага на праверку ўмення навучэнцаў працаваць з рознымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі: фрагментам гістарычнага дакумента, гістарычнай картай, схемай, табліцай, дыяграмай, графікам, фрагментам артыкула, ілюстрацыяй, іншымі крыніцамі.

У Міністэрстве адукацыі звяртаюць увагу, што **у бягучым навучальным годзе выпускны экзамен па «Гісторыі Беларусі» будзе праводзіцца з выкарыстаннем адзіных практычных заданняў для ўсіх устаноў адукацыі, якія рэалізоўваюць адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. Практычныя заданні для правядзення выпускнога экзамену будуць размешчаны 25 мая 2023 года на нацыянальным адукацыйным партале.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# НОЧЧУ — МОЦНЫЯ МАРАЗЫ, А ЎДЗЕНЬ — МОКРЫ СНЕГ І ДОЖДЖ

## У ноч на сераду чакаецца да мінус 13—17

**Своеасаблівы люты ў нас атрымліваецца. То прымарозіць, то адпусціць і амаль адліга. На гэтым тыдні ў нас чакаецца снег, мокры снег, дажджы і туманы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак у многіх раёнах краіны прагназуецца кароткачасовы мокры снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. А вось у сераду будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі прагназуюцца слабыя туман і шэрань. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 5—12 градусаў, пры праясненнях — 13—17 марозу, па паўднёвым захадзе — 3—4 градусы ніжэй за нуль. Днём тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

У сераду ў фарміраванне надвор'я ўмяшаецца грэбень антыцыклону, які сфарміруецца ў халоднай паветранай масе. Паказанні бароментраў будуць актыўна расці, у аблоках з'явяцца ўстойлівыя прасвятленні, ападкі спыняцца, але ў начныя гадзіны тэмпература паветра панізіцца.

У чацвер чакаецца надвор'е пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі будуць слабыя туман і шэрань. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад 3 марозу па паўночным захадзе да мінус 12 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. Пры праясненнях у Гомельскай і Магілёўскай абласцях будзе 13—15 марозу. Удзень тэмпература паветра складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

У ноч на пятніцу грэбень высокага ціску яшчэ будзе ўтрымліваць свае пазіцыі, а вось у ранішнія гадзіны на тэрыторыю нашай краіны правруцца атмасферныя франты, якія да канца тыдня будуць прыносіць усё новыя порцыі ападкаў, надвор'е стане пахмурным, у Беларусь вернецца еўразіма. Маразы пойдуць на спад, а ападкі зноў пачнуць выпадаць у выглядзе снегу і мокрага снегу, па паўднёвым захадзе — кароткачасовы дождж.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ноччу будзе пераважна без ападкаў, а раніцай і днём на большай частцы краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па паўднёвым захадзе магчымы дождж. Месцамі будзе слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 4 да 9 марозу, пры праясненнях — да мінус 12 градусаў. Тэмпература днём будзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

У суботу на большай частцы краіны чакаюцца ападкі (снег, мокры снег, па паўднёвым захадзе магчымы дождж). У асобных раёнах магчымыя слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да 7 марозу, пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Днём слупок тэрмометра можа вагацца ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Турцыі адбылося адно з наймацнейшых за апошнія 100 гадоў землетрасенняў



**У ноч на панядзелак у турэцкай правінцыі Кахраманмараш адбылося землетрасенне магнітудай не менш за 7,8. Яно суправаджалася 32 афтэршокамі, наймацнейшы з якіх быў магнітудай 6,6.**

Падземныя штуршкі таксама адчуваліся ў некалькіх правінцыях Сірыі, Ліване і Іраку. З-за стыхіі абрынуліся сотні будынкаў, пад заваламі застаюцца людзі. Упраўленне па надзвычайных сітуацыях Турцыі паведаміла, што па апошніх звестках, а інфармацыя яшчэ ўдакладняецца, у выніку стыхійнага бедства ў Турцыі загінулі 1498 чалавек, паранены 7634. У Сірыі, паводле звестак Міністэрства аховы здароўя, колькасць загінулых вырасла да 592 чалавек.

Эпіцэнтр землетрасення знаходзіўся за 37 кіламетраў ад Газіянтэпа.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Прэзідэнту Турцыі Рэджэпу Таіпу Эрдагану і Прэзідэнту Сірыі Башару Асаду ў сувязі са шматлікімі ахвярамі землетрасення ў гэтых краінах, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «З вялікім болем успрынялі ў Беларусі сумную вестку аб наступствах аднаго з самых разбуральных землетрасенняў на паўднёвым усходзе Турцыі, якое прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяр, знішчыла гістарычныя і культурныя помнікі, аб'екты інфраструктуры і жыццезабеспячэння», — гаворыцца ў спачуванні кіраўнікам дзяржаў. Ад імя беларускага народа і сябе асабіста Аляксандр Лукашэнка выказаў шчырыя спачуванні і словы падтрымкі Рэджэпу Таіпу Эрдагану і Башару Асаду, родным і блізкім загінулых. Ён пажадаў хутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым, а таксама аднаўлення разбуранай стыхіяй інфраструктуры і вяртання да звычайнага ладу жыцця».**

У сувязі з разбуральнымі землетрасеннямі ў Сірыі і Турцыі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад міністра па надзвычайных сітуацыях Вадзіма Сіняўскага аб гатоўнасці МНС Беларусі да аказання дапамогі пацярпелым дзяржавам, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі. Па выніках даклада Аляксандр Лукашэнка даручыў накіраваць у Турэцкую Рэспубліку аварыйна-выратавальны атрад МНС, атэставаны па міжнародных стандартах ААН, у складзе 64 спецыялістаў з тэхнікай і рыштункам.

### AP: Джо Байдэн страціў падтрымку большасці дэмакратаў для перавыбрання ў прэзідэнты ЗША

**Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн страціў падтрымку большасці прадстаўнікоў дэмакратычнай партыі для перавыбрання на другі прэзідэнцкі тэрмін. Пра гэта сведчыць апытанне, праведзенае інфармацыйным агенцтвам Associated Press.**

Адзначаецца, што толькі 37 % дэмакратаў зноў гатовы бачыць Байдэна прэзідэнтам, у той час як у лістападзе мінулага года палітыка падтрымлівалі 52 % апытаных дэмакратаў.

Многія ўдзельнікі апытання ў якасці галоўнай прычыны, па якой Байдэну не трэба балатавацца на другі тэрмін, назвалі яго 80-гадовы ўзрост.

### Фінансіст з ЗША дапусціў закат долара як рэзервовай валюты на працягу 10 гадоў

**Амерыканскі эканаміст Нурыэль Рубіні дапусціў закат долара ў якасці рэзервовай валюты на працягу 10 гадоў. Аб гэтым піша газета Financial Times.**

Па словах эканаміста, геапалітычнае сапернiцтва паміж ЗША і КНР, якое ўзмацняецца, справакуе з'яўленне дзвюх канкуруючых сусветных рэзервовых валют.

У якасці прыкладу Рубіні прывёў Кітай і Саудаўскую Аравію, якія ўжо правялі першую транзакцыю ў юанях. Эканаміст падкрэсліў, што такая практыка можа стаць нормай і для іншых дзяржаў.

«Заняпад долара ЗША як асноўнай рэзервовай валюты, верагодна, адбудзецца на працягу наступнага дзесяцігоддзя», — адзначыў Рубіні. Ён дадаў, што, акрамя нацыянальных валют, долару пагражаюць лічбавыя валюты і плацежныя сістэмы WeChat Pay і Alipay.

**У Віцебскай вобласці больш за 50 працэнтаў аўтамабільных дарог патрабуюць рамонту. Капітальнага — звыш 480 кіламетраў дарожных артэрый або 16,2 працэнта ад агульнай працягласці; бягучага, які прадухіліць інтэнсіўны знос, — звыш 35 працэнтаў. З-за паскоранага разбурэння больш за тысячу сто кіламетраў дарог маюць абмежаванні па нагрузцы да шасці тон.**

# АД АГУЛЬНАГА ДА ПРЫВАТНАГА

Абслугоўваннем аўтамабільных дарог рэспубліканскага значэння ў паўночным рэгіёне займаецца рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскаўтадар», на балансе якога знаходзіцца каля трох тысяч кіламетраў. У гэтым ліку 358 мастоў агульнай працягласцю больш за 14 тысяч метраў. За абслугоўванне мясцовых дарог адказвае камунальнае праектна-рамонтна-будаўнічае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» — гэта амаль 15 тысяч кіламетраў, 857 мастоў і пуцеправодаў, звыш 14 тысяч водапрапускных труб. У склад прадпрыемства ўваходзяць 24 філіялы: 21 дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне (у раёнах), упраўленне вытворча-тэхнічнай камплектацыі, філіял «Віцебскдарпраект» і сельскагаспадарчы філіял «Кляўцы».



## Навясныя шляхі

У кастрычніку 2022 года ў Віцебскім раёне і Наваполацку пасля рэканструкцыі ўрачыста адкрылі два масты праз раку Каспля ў г. п. Сураж і Заходнюю Дзвіну. Два гэтыя збудаванні маюць стратэгічную важнасць для пасёлка і горада-нафтавіка, бо звязваюць дзве часткі названых населеных пунктаў. У Мёрскім раёне летась адкрыўся абноўлены мост праз раку Ауту. У планах на гэты год пазначаны бягучы рамонт трох мастоў на аўтадарогах мясцовага значэння: мост праз раку Сакалянка на аўтадарозе Орша — Коханава — Обальцы ў Талачынскім раёне, мост на пад'ездзе да вёскі Сосніна ў Шумілінскім раёне і мост на аўтадарозе Казакі — Сасноўцы Шаркаўшчынскага раёна. Акрамя таго, працягнецца рэканструкцыя моста праз раку Свячанка рэспубліканскай аўтатрасы М3 Мінск — Віцебск.

## Тэмпературныя скокі

У гэтую зіму работнікі дарожных службаў маюць у разы больш ям, чым у мінулую. Прычына заключаецца ў частых пераходах тэмпературы праз нуль градусаў. Згладзіў бы праблему стабільны мінус зімой, аднак цяпер мы назіраем гуллівы настрой надвор'я: на Віцебшчыне ў пачатку студзеня снежнае покрыва цалкам растала, а пасля па яшчэ непакрытых снегам зямлі і асфальце стукнуў марозік. На дарожным палатне спачатку ўзнікаюць расколіны, у іх зацякае вада, якая ў працэсе замарожвання-адтавання робіць іх з часам усё большымі. Гэта сезонная з'ява, якая іграе відавочна не на руку дарожнікам. Што датычыцца якасці дарожных работ зімой, то адрамантаваныя ўчасткі асфальту падлягаюць замене ў цёплы перыяд. Калі атрымалася «залячыць» якасна, такі ўчастак будуць рамантаваць па неабходнасці, але варта разумець, што галоўнай абаронай супраць сезонных дэфектаў палатна з'яўляецца якасная перакладка асфальту.

## Ёсць план — будзем працаваць

«Стан аўтамабільных дарог аказвае непасрэдны ўплыў на сацыяльна-эканамічныя аспекты развіцця эканомікі краіны, перш за ўсё на работу аўтатранспарту, рэнтабельнасць прадпрыемстваў і ўмовы жыцця насельніцтва. У апошнія гады ў сувязі з недафінансаваннем дарожнай галіны пакрыццё дарог руйнуецца паскоранымі тэмпамі, — расказалі спецыялісты РУП «Віцебскаўтадар». — Патрэба сродкаў на правядзенне рамонтных мерапрыемстваў пры ўмове давядзення транспартна-эксплуатацыйнага стану рэспубліканскіх аўтамабільных дарог вобласці да нарматыўных патрабаванняў у 2023 годзе складае больш за 474,5 мільёна рублёў. Фізічны аб'ём патрэбнасці ў рамонтах — звыш 1,5 тысячы кіламетраў, што складае 51,5 працэнта ад агульнай працягласці».

Мяркуючы па выдаткаваных сродках на ўтрыманне, бягучы і капітальны рамонты з рэспубліканскага дарожнага фонду — 116,7 мільёна рублёў — нарматыўныя патрабаванні ў поўным аб'ёме паўночны рэгіён не выканае, аднак складаныя ўчасткі дарог будуць адрамантаваны. У 2023 годзе запланаваны капітальны рамонт 12,87 кіламетра рэспубліканскіх аўтамабільных дарог Віцебскай вобласці, у тым ліку дарогі Р22 Орша — Дуброўна — да М1/Е30 (Буда) на ўчастку 2,950 — 8,750 км. Будзе выконвацца капітальны рамонт трасы М1/Е30 Брэст (Казловічы) — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі (Радзькі) на ўчастку 573,800 — 580,864 км, а таксама пуцеправода на 555,824 км аўтадарогі М1/Е30. На капітальны рамонт аўтадарог вобласці будзе накіравана 27,1 мільёна рублёў.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## Што хвалюе вёску?

Абслугоўваннем і рамонтам сельскіх дарог займаюцца філіялы КУП «Віцебскаблдарбуд», у Віцебскім раёне за якасць абслугоўвання дарожнай сеткі адказвае ДРБУ-144, на дапамогу калегам прыходзіць і дзяржаўнае прадпрыемства «ЖРЭП Віцебскага раёна». Па меры фінансавых і тэхнічных магчымасцяў работнікі ДРБУ рэгулярна праводзяць работы па ўкладцы новага асфальтавага палатна на складаных участках дарог. Так у кастрычніку мінулага года ў вёсцы Зайцава Лятчанскага сельсавета дарожнікі не толькі абнавілі трасу, але і па просьбе мясцовых жыхароў усталявалі дадатковы прыпынак. Напярэдадні раённых дажынак у г. п. Янавічы з'явілася новая кальцавая развязка, на грунтавых сельскіх дарогах у вёсцы Бердпікі праведзены ямачны рамонт. У 2021 годзе на трасе Віцебск — Сіроціна быў пакладзены новы асфальт, што істотна спрасціла шлях сельскіх жыхароў з бліжэйшых вёсак у Віцебск. Увогуле, дарожная сітуацыя ў населеных пунктах у радыусе 20-30 кіламетраў ад абласнога цэнтра спрыяльная, чаго не скажаш пра аддаленыя населеныя пункты, якія мяжуюць з Расіяй. На трасе Віцебск — Шлыкі добры асфальт пасля вёскі Курына змяняецца грунтавай дарогай. Асфальт пакладзены толькі ў межах вёсак, а шлях ад адной да другой па выбоінах займае па часе практычна столькі, колькі і пераадоленне 60 кіламетраў па трасе. Паварот на вёску Кавалёва Запольскага сельсавета і каля 9 кіламетраў да яе — грунтавая выбітая дарога — істотна ўскладняе работу аўтакрамы, хуткай дапамогі і іншых службаў. У тых краях вядуцца актыўныя работы па лесанарыхтоўцы і, верагодна, асфальт не вытрымаў бы вагі спецтэхнікі, якая актыўна там курсіруе. Маладзікім жыхарам Кавалёва застаецца спадзявацца толькі на рэдкі грэйдар. Але, магчыма, у будучыні траса на Шлыкі стане не горшай за рэспубліканскую.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

### Факт

**За 10 месяцаў 2022 года ў паўночным рэгіёне па Дзяржаўнай праграме «Дарогі Беларусі» правялі бягучы рамонт больш 133 кіламетраў і капрамонт 5 кіламетраў дарог рэспубліканскага значэння. За студзень—кастрычнік завяршылі бягучы рамонт на 263 кіламетрах дарожных артэрый мясцовага значэння.**

# Дарожны кантроль

**Супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі Гомельскай вобласці штодзень ажыццяўляецца маніторынг стану вулічна-дарожнай сеткі з мэтай выяўлення недахопаў і парушэнняў правіл утрымання. На асаблівым кантролі — вызначэнне крытычных дэфектаў дарожнага пакрыцця, недапушчальных для гарантавання бяспекі дарожнага руху.**

Як адзначылі ва ўпраўленні ДАІ Гомельскага аблвыканкама, падчас маніторынгу толькі за перыяд з 24 студзеня па 1 лютага на тэрыторыі Гомельскай вобласці было выяўлена больш за 250 участкаў з дэфектамі дарожнага пакрыцця, якія недапушчальны па патрабаваннях тэхнічных нарматыўных прававых актаў. У мэтах ухілення выяўленых недахопаў на адрас балансатрымальнікаў вулічна-дарожнай сеткі Гомельскай вобласці выдадзена 91 прадпісанне. За наяўнасць крытычных дэфектаў у дарожным пакрыцці ў выглядзе выбоін, недапушчальных па ўмовах гарантавання бяспекі дарожнага руху, у адносінах да службовых асоб дарожных і камунальных арганізацый складзена 25 адміністрацыйных матэрыялаў па артыкуле 18.32 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь.

У сэрцы рэгіёна — Гомелі — дарожнае пытанне на асаблівым кантролі кіраўніцтва гарвыканкама. Інфармацыю, у тым ліку аб неабходнасці ямачнага рамонту на розных участках вуліц абласнога цэнтра, цяпер гамяльчане могуць дасылаць у чат-бот. Гэта новы фармат зваротнай сувязі з жыхарамі горада старшыні Гомельскага гарвыканкама Уладзіміра Прывалава. Праз месенджар гамяльчане могуць атрымаць і дакладную інфармацыю аб стане дарожнай гаспадаркі горада і бягучых рамонтах дарожнай сеткі.



Так, з пачатку зімовага перыяду дарожнымі службамі Гомеля выканана звыш 630 метраў квадратных ямачнага рамонту асфальтабетоннага пакрыцця гарадскіх вуліц. Каля 380 метраў квадратных дарожнага палатна былі адрамантаваны ўжо у бягучым годзе. Праводзяць работы Гомельскі гарадскі дарожны будаўніча-рамонтны трэст. У абнаўленні дарожнай гаспадаркі горада задзейнічаны пяць мабільных рамонтных брыгад. Асаблівая ўвага вуліцам з рухам грамадскага транспарту. Тым не менш, неабходную ўвагу дарожнікі надаюць другарадным вуліцам і ўездам на дваровыя тэрыторыі.

Між тым на мінулым тыдні праблемам добраўпарадкавання тэрыторыі абласнога цэнтра, аператыўнага абслугоўвання і ўтрымання дарог была прысвечана сустрэча памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектара па Гомельскай вобласці Сяргея Барташа з калектывам гомельскага прадпрыемства «ГарСАП», якое спецыялізуецца на добраўпарадкаванні гарадскіх вуліц.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці паставіў задачу перад дарожнымі службамі Гомеля павысіць аператыўнасць і якасць утрымання праезнай часткі і тратуараў як найбольш складаных у тэхнічным плане ўчасткаў. На гэты год узгоднена праграма па абнаўленні парка тэхнікі. Плануецца набыць 15 высокапрадукцыйных машын для абслугоўвання дарожнай сеткі горада.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Віток ва ўзроўні якасці жыцця вяскоўцаў

## забяспечвае прыведзеная ў парадак дарога

**Дарога, што злучае два аграгарадкі — Дзмітравічы і Хадасы, асабліва той яе ўчастак кіламетра ў паўтара, да пясчанага кар'ера, — заўсёды была для мясцовых жыхароў праблемай. Грузавікі кожны дзень ходзяць да кар'ера і назад, яшчэ — транспарт сельгаспрадпрыемства, адным словам, машыны разбівалі шлях так, што ў прамым сэнсе было не прайсці, не праехаць, асабліва ў сезон дажджоў. Легкавікі буксавалі, а пешаход мог пераадолець адлегласць ад адной вёскі да другой толькі ў гумовых ботах. Бягучыя рамонты давалі часовы эфект.**



Старшыня Дзмітравіцкага сельвыканкама Вячаслаў РУСАКЕВІЧ паказвае дарогу на Хваянаўку.

Асабліва цярпелі жыхары вёскі Унучкі. Скаргі сыпаліся ў выканкамы розных узроўняў, службовыя асобы добрасумленна запісвалі змест званкоў на прамыя лініі, затым пісалі адказы, з якіх вынікала, што дарога — у планах. Калі нарэшце тыя планы набылі абрысы канкрэтных спраў і на ўчастак зайшла тэхніка будаўнічага ўпраўлення, людзі ўздыхнулі з палёгкай. Дарогу заасфальтавалі.

Паводле слоў **старшыні Дзмітравіцкага сельскага Савета Вячаслава РУСАКЕВІЧА**, карэннае паляпшэнне дарогі адназначна ўзняло на прыступку якасць жыцця людзей з навакольных вёсак. Тыя ж Унучкі набылі новы віток у сваім развіцці. Гэта прыпушчанская вёска засталася амаль без сталых жыхароў па натуральных прычынах. Тут і раней набывалі ўчасткі, куплялі старыя хаты гараджане. А цяпер, калі ёсць добрая дарога, працэс пайшоў яшчэ хутчэй.

— За апошнія два гады многа зроблена ў паляпшэнні мясцовых дарог, — гаворыць старшыня сельвыканкама. — Асабліва вялікі аб'ём работы прыйшоўся на 2021 год, калі ў нас праходзілі раённыя дажынкі. Тады заасфальтавалі каля 10 кіламетраў дарог і вуліц. Работу прадоўжылі і ў 2022 годзе. Вось, скажам, адрэзак даўжынёй у 2,9 кіламетра на дарозе Трасцяніца — Свішчава — Вайская — Галоўчыцы пасля пракладкі асфальтавага пакрыцця зрабіў даступным для ўсіх відаў транспарту новы малочнатаварны комплекс, а яшчэ палепшыў камунікацыі да ўсіх названых вёсак. Заадно паэтапна паляпшалася дарога з Дзмітровічаў на Асінпікі. Асфальтавалі па меры фінансавання: спачатку кавалак 745 метраў, потым 550 метраў, затым яшчэ. І за год аднавілі дарогу працягласцю 1436 метраў. Для нас гэта асабліва важна. Вялікая частка сельсавета размешчана фактычна на тэрыторыі Белавежскай пушчы, якая штогод прыцягвае падарожнікаў з усіх напрамкаў. На нашай тэрыторыі, напрыклад, знаходзіцца 16 аграсядзіб, далёка не кожны раён сёння можа пахваліцца такой колькасцю падобных аб'ектаў. А дарога служыць візітоўкай, як не круці. Першае, што бачыць перад сабой госць, — дарога. Ну і пра якасць жыцця я ўжо згадваў, дарога — перадумова ўсяму. Ці трэба казаць, што па добрай дарозе без праблем пры неабходнасці можа дабрацца хуткая дапамога, транспарт аддзела па надзвычайных сітуацыях, гандлёвая арганізацыя з прадуктамі?

Далей кіраўнік мясцовай улады запрашае паглядзець новы ўчастак дарогі ў напрамку з Дашэвічаў на Хваянаўку. Нейкі час едзем па знакамітай аб'язной дарозе вакол Белавежскай пушчы, затым паварочваем на Хваянаўку. Наперадзе шлях перабягае маладая казулька — пушчанскія насельнікі тут адчуваюць сябе камфортна. Пад лютаўскім дробным дажджом (2 лютага. — **Аўт.**) дарога паблісквае аднosна новым асфальтам.

«У планах было такое ж пакрыццё на ўчастку Абрамава — Макавішча, — тлумачыць старшыня, — але планы скарэкціравалі, і пакуль работа па пракладцы асфальту была адкладзена, у планах на гэты год значыцца рамонт пясчана-гравійнага пакрыцця названага ўчастка працягласцю 2,3 кіламетра».

Усе работы па паляпшэнні дарог выконвае Высокаўскае ДРБУ-137. Яны ж займаюцца і бягучым, ямачным рамонтам. Зімой, калі здаралася некалькі дзён снегападаў на нашай тэрыторыі, дарогі расчышчалі даволі аператыўна, на сігналы мясцовай улады рэагавалі своечасова.

— Вядома, хацелася б, каб наўкола быў асфальт, але ж у нас 29 населеных пунктаў, у 13 з іх пражывае да дзесяці чалавек. І мы разумеем, што ў першую чаргу паляпшаюцца ажыўленыя, запатрабаваныя шляхі. Астатнія падтрымліваюцца ў здавальняльным стане бягучымі рамонтамі.

**Анатоль БАГАЦЕЕЎ, намеснік старшыні Камянецкага райвыканкама:**

***— Па тэрыторыі нашага раёна праходзіць 640 кіламетраў мясцовых дарог, а таксама 179 кіламетраў вуліц населеных пунктаў. З 2017 года працуем па іх паляпшэнні ў рамках праграмы «Дарогі Беларусі». За мінулы год пракладзена 9 кіламетраў новага асфальтабетоннага пакрыцця, а таксама на 21 кіламетры праведзены бягучы рамонт. Дарэчы, пад канец года былі дабаўлены сродкі на ўказаныя мэты, за кошт гэтага атрымалася палепшыць больш дарог, чым запланавалі першапачаткова. Летась таксама быў праведзены капітальны рамонт моста на дарозе Ратайчыцы — Млыны — Алешкавічы.***

***На гэты год рамонт намечаны на ўчастках агульнай працягласцю ў 19 кіламетраў. Замест гравійкі з'явіцца асфальт на ўчастку 2,1 кіламетра дарогі Каралін — Кунахавічы, затым на такім жа ўчастку — Камянец — Мартынюкі — Пруска. На дзвюх дарогах — Турна Вялікая — Дзямянчыцы і Гарадзішча — Хадосы — будзе праведзена павярхоўная апрацоўка, якая дазваляе пры з'яўленні трэшчын абараніць дарожнае палатно ад далейшага разбурэння. Гэта апрабаваная часам тэхналогія падразумявае разліў вязкай масы з далейшым уездждваннем. Такім чынам будуць апрацаваны пэўныя ўчасткі дарог. А, напрыклад, на дарозе Вярховічы — Капылы — Каралін (1,7 кіламетра) з'явіцца асфальт, як і на 2,9 кіламетра дарогі Камянец — Трасцяніца — Лышчыцы — Воўчын. Плануем рамонт гравійнага пакрыцця на пад'ездзе да вёскі Сарава. Будзе абсталявана не менш за пяць аўтобусных прыпынкаў. Ну, і бягучы рамонт грунтавых дарог, ямачны рамонт — штодзённых клопаты.***

Паводле інфармацыі камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Брэсцкага аблвыканкама, на ўтрыманне і рамонт дарог Брэсцкай вобласці ў 2023 годзе з розных крыніц фінансавання будзе накіравана 160 мільёнаў рублёў. З абласнога бюджэту на гэту работу выдзяляецца 76,5 мільёна. Мяркуецца адрамантаваць не менш за 215 кіламетраў мясцовых дарог і 6 мастоў. Чатыры аварыйныя масты перабудуюць на водапрапускныя трубы.

Акрамя гэтага, з рэспубліканскага дарожнага фонду Брэсцкай вобласці будзе выдаткавана каля 30 мільёнаў рублёў. У асноўным гэтыя сродкі будуць накіраваны на рэканструкцыю вуліц. Вулічную сетку абновяць у Брэсце, Баранавічах, Бярозе, Ганцавічах, Драгічыне, Іванаве, Лунінцы, Ляхавічах, Пінску, Пінскім раёне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*



Новы ўчастак дарогі Трасцяніца — Свішчава — Вайская — Галоўчыцы.

### У тэму

## Каб рух па мосце не перакрываць

Сёлета ў Лунінцы плануюць пачаць капітальны рамонт пуцеправода праз чыгунку. Праект рыхтуе РУП «Брэстаўтадар». Спецыялісты гэтай арганізацыі будуць займацца і будаўнічымі работамі.

Варта адзначыць, што мост пакуль знаходзіцца ў здавальняльным стане. Але ўзведзены ён у 1986 годзе. Праз гэты мост ідзе асноўны ўезд у горад з аўтадарогі М10, мост фактычна раздзяляе горад на дзве часткі, іх сувязь асабліва важная з пункту гледжання мікрараёнаў новай забудовы. Калі ж яго не рамантаваць загадзя і ён зробіцца аварыйным, такая сітуацыя памяняе ўсё жыццё горада, і не ў лепшы бок. Адна палова райцэнтра, па сутнасці, акажацца аддзеленай ад другой, аб'езд складзе каля 20 кіламетраў.

«Работы плануецца пачаць у сярэдзіне года, — паведаміў **намеснік старшыні Лунінецкага райвыканкама Сяргей ЧАРНЕНКА.** — Капітальны рамонт прадугледжана правесці за 18 месяцаў у тры этапы. Пры гэтым частка моста будзе перакрытая, а на другой арганізуюць двухпалосны рух. Як гэта было, напрыклад, пры рэканструкцыі Кобрынскага моста ў Брэсце напярэдадні 1000-гадовага юбілею горада. Такі спосаб забяспечвае рамонтныя работы і бесперапынны рух адначасова».

### Тым часам

## Надвор'е — не апраўданне

**Намеснік прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК у панядзелак, 6 лютага, правёў нараду па пытаннях паводкавай сітуацыі, стане аўтамабільных дарог і вуліц населеных пунктаў і рабоце ЖКГ па прыборцы тэрыторый, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Па звестках Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, за адзін месяц — студзень — на рэспубліканскіх і мясцовых аўтадарогах, вуліцах населеных пунктаў адбылося каля 400 дарожна-транспартных здарэнняў, якія звязаныя з дэфектамі дарожнага пакрыцця, або чацвёртая частка ад усёй колькасці такіх дарожна-транспартных здарэнняў, зафіксаваных за ўвесь 2022 год», — паведаміў Анатоль Сівак.

Таксама, паводле яго слоў, сёлета ўжо ў студзені ў некаторых рэгіёнах склалася неспрыяльная гідралагічная абстаноўка, звязаная з падтапленнем паводкавымі і адталымі водамі асобных участкаў дарог і мастоў, жылых дамоў і прыватных падворкаў, дач. «Разам з тым, наракаць толькі на надвор'е не даводзіцца. Хапае парушэнняў, сістэмных недапрацовак і банальнай халатнасці на месцах. Часта мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, у зоне адказнасці якіх знаходзяцца пытанні ўтрымання і рамонту вулічна-дарожнай сеткі населеных пунктаў і прыборкі тэрыторый, не ўдзяляюць гэтаму належнай увагі. Планаванне бягучых і капітальных рамонтаў вуліц ажыццяўляецца на недастатковым узроўні. Арганізацыя і кантроль за прыборкай тэрыторый у поўнай меры і аб'ёме не забяспечваецца. У выніку маем рост заявак і прэтэнзій ад насельніцтва. Гэта фарміруе негатыўны эмацыйны фон першым чынам у адрас мясцовых органаў улады. Аналіз зваротаў у службу 115 паказвае, што ў 2022 годзе больш за ўсё заявак на нездавальняючае ўтрыманне вуліц узрасло ў населеных пунктах Віцебскай вобласці, у прыватнасці ў Шаркаўшчынскім, Ушацкім, Полацкім, Наваполацкім, Мёрскім і Пастаўскім раёнах. Найбольшая колькасць заявак па прыборцы прыдамовых тэрыторый адзначаецца ў Мінскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях», — падкрэсліў ён.

Віцэ-прэм'ер дадаў, што мясцовымі органамі ўлады не забяспечваецца ў поўнай меры рэалізацыя дадзеных заканадаўствам паўнамоцтваў па прыцягненні суб'ектаў гаспадарання і грамадзян да выканання работ па падтрыманні належнага санітарнага стану тэрыторый населеных пунктаў. «Неабходна актыўна прыцягваць грамадзян да прыборкі снегу на дваровых тэрыторыях і забяспечваць іх інвентаром. На гэта неаднаразова ўказваў кіраўнік дзяржавы, прэм'ер-міністр, а таксама кіраўніцтва Савета Рэспублікі. У сувязі з гэтым сёння разгледзім абазначаныя ў парадку дня нарады пытанні, вызначым існуючыя праблемы і шляхі іх вырашэння.Трэба выпрацаваць такія рашэнні, якія дазволяць нам, нягледзячы на ўмовы надвор'я, забяспечваць належную якасць функцыянавання інфраструктуры і паўсядзённую жыццядзейнасць насельніцтва. Мяркую, падобныя сустрэчы ва ўрадзе мы будзем праводзіць штомесяц, а на ўзроўні міністэрстваў, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і райвыканкамаў гэта неабходна рабіць штотыдзень», — заявіў Анатоль Сівак.

# Бяспека «сэрца» БелАЭС

## Паўгода на выпрабаванні

Па насычанасці тэхналагічных інжынерных сістэм такіх аб'ектаў, як АЭС, у Беларусі больш няма. Пасля выхаду з планавага рамонту першы блок эксплуатуецца на намінальнай магутнасці — 1170 МВт. Аднак гэты паказчык залежыць ад тэмпературы ахаладжвання вады на ўваходзе і на выхадзе — на момант наведвання станцыі журналістамі энергаблок працаваў на 1180 МВт, расказаў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*— Амаль усе будаўніча-мантажныя работы на другім блоку практычна завершаны, усё зманціравана і знаходзіцца ў стадыі перадпускавых аперацый (даводачна-наладачных работ). Аднак першае падключэнне другога энергаблока да сеткі не азначае, што ён ужо не будзе пасля адключацца. Згодна з праграмамі выпрабаванняў, мы павінны падымаць узровень магутнасці энергаблока да пэўных велічынь, пасля праводзіць выпрабаванні, скідваць магутнасць да нуля і праводзіць выпрабаванні ў гэтым стане.*

Уключаецца рэактарная ўстаноўка на магутнасці 40—50 МВт, пасля чаго патрэбен амаль месяц выпрабаванняў. Потым магутнасць падымаецца да 75 МВт, і зноў выпрабаванні. Пасля — 90 МВт, і па той жа схеме да поўнай магутнасці, так што працэс зойме не менш за паўгода. Пры гэтым самае галоўнае падчас працэсу — забяспечыць ядзерную і радыяцыйную бяспеку. Таму калі на стадыі выпрабаванняў і пусканаладачных работ з'явіцца хоць бы мінімальная заўвага, то працэс цалкам спыняецца, каб разабрацца, падкрэсліў спецыяліст:

*— Пасля разбору прымаюцца тэхнічныя рашэнні, якія павінны прайсці экспертызу на бяспеку ў незалежных арганізацыях. Пасля гэтага мы рухаемся наперад або спачатку. Шчыльна супрацоўнічаем з нашым рэгулятарам — Дзяржатамнаглядам. Чарговая праверка на станцыі прайшла літаральна на мінулым тыдні, цяпер вядзецца работа з гэтай арганізацыяй, каб атрымаць дазвол выйсці на наступны этап — пачатак ланцуговай рэакцыі. Пасля выхаду на 100 % магутнасці і правядзення ўсіх выпрабаванняў пачнецца этап доследна-прамысловай эксплуатацыі, а ў другім паўгоддзі чакаецца ўвод энергаблока ў эксплуатацыю.*

## Дыверсіфікацыя, перспектыва і экалогія першага, другога і трэцяга...

Прапрацоўка магчымасці будаўніцтва АЭС у Беларусі пачалася яшчэ ў 2005-м пасля зацвярджэння канцэпцыі энергетычнай бяспекі. Найпершай задачай падчас вывучэння мэтазгоднасці будаўніцтва была дыверсіфікацыя паставак відаў паліва ў краіну, іншымі словамі, эканоміка вытворчасці электраэнергіі, нагадаў Міхаіл Міхадзюк, гаворачы пра магчымае будаўніцтва ў краіне другой АЭС:

*— Тады 96 % цяпла і электраэнергіі ў Беларусі выпрацоўвалася на прыродным газе. Паралельна з*



*развагамі над будаўніцтвам БелАЭС вялася работа па ўцягненні ў абарот мясцовых відаў паліва і аднаўляльных крыніц энергіі. Рашэнне аб мэтазгоднасці будаўніцтва атамнай станцыі прынялі ў 2008-м. Другі момант — перспектыва, таму што, хоць нарматыўнае «жыццё» атамнай станцыі — 60 гадоў, яе тэрмін можа (па выніках дыягностыкі) падоўжыцца яшчэ гадоў на 20. А выраб электраэнергіі на АЭС па затратах ніжэйшы, чым на класічных станцыях. І трэці — экалагічнасць, бо гэта экалагічна чыстая крыніца энергіі, якая ствараецца.*

Што датычыцца перспектывы з'яўлення ў краіне трэцяга энергаблока, то першы этап работы ў гэтым кірунку ўжо вядзецца. Ацэнены прагноз спажывання электраэнергіі ў краіне на перспектыву. Другі этап датычыцца магчымасці ўпісацца ў рэжым работы беларускай энергасістэмы, адзначыў намеснік міністра:

*— Для гэтага краіна павінна выйсці на пэўны рэжым спажывання электраэнергіі, і мы цяпер над гэтым працуем. У Беларусі прынята некалькі праграм павелічэння электраспажывання, найбольш паспяховая з якіх, пэўна, — укараненне сістэм электраацяплення і электрападагрэву вады ў сельскай мясцовасці. Актыўна развіваецца і кірунак электратранспарту. Цяпер мы вывучаем пытанне разам з Мінэканомікі, НАН Беларусі і іншымі міністэрствамі, каб распрацаваць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне для прыняцця канчатковага рашэння. Але задача такая існуе.*

## Найперш сельскія электрасеткі

Атамная станцыя дазваляе нівеліраваць эканоміку. З уводам другога энергаблока менш эканамічна выгадныя энергетычныя магутнасці будуць пакінуты ў рэзерве, а тыя, што ўжо адпрацавалі свой тэрмін, выведзены з эксплуатацыі, дадаў ён:

*— Схема выдачы магутнасці БелАЭС запраграмавана такім чынам, што ў нас ва ўсіх рэгіёнах асноўныя сеткі збудаваны з улікам перспектывы. Што датычыцца размеркавальных сетак, то вялікіх пытанняў па іх няма. Ёсць пытанні па сельскіх размеркавальных сетках, бо расце попыт на электраэнергію ад насельніцтва. Паступіла больш як 80 тысяч заявак, і 84 % з іх мы рэалізавалі. У асобных мясцовасцях сеткі будаваліся па нарматывах, калі на дом было разлічана 3,5—5 кВт·г, а цяпер дамам патрэбна па 15—20, а то і па 30—40 кВт·г, таму сумесна з аблвыканкамамі распрацавана праграма рэканструкцыі электрасетак. Найперш яна закране аграгарадкі і перспектыўныя населеныя пункты. Не забудземся і на малыя населеныя пункты, адкуль да нас звяртаюцца, асабліва пенсіянеры і шматдзетныя сем'і. Цяпер мы рыхтуем праграму па мадэрнізацыі такіх сетак на наступную пяцігодку.*

Летась было мадэрнізавана каля 1,7 тысячы кіламетраў электрасетак, і надалей гэтая работа працягнецца з улікам новых камфортных умоў для пражывання насельніцтва, паабяцалі энергетыкі.

## На 16-й адзнацы

Узровень допуску журналістаў гэтым разам быў распаўсюджаны на некалькі месцаў. У прыватнасці, на цэнтральны пункт кіравання АЭС, адкуль у рэжыме анлайн кругласутачна можна бачыць, як электраэнергія разыходзіцца ў рэгіёны краіны і падтрымліваць сувязь з дыспетчарамі. Тут кантралююцца параметры і кіраванне абсталяваннем камплектнай размеркавальнай прылады. А ўсе спецыялісты прайшлі працоўны шлях ад абходчыкаў да начальніка змены блокаў.

Наведалі журналісты і турбінную залу першага энергаблока, дзе змешчана асноўнае цеплатэхнічнае абсталяванне другога контуру: помпы, цеплаабменнікі, арматура, і «сэрца» энергаблока — турбіна, якая задае рытм работы ўсяго абсталявання і персаналу. Магутнасць паравай турбіны — 1200 МВт, частата кручэння — 3000 абаротаў за хвіліну, агульная вага — 2,5 тысячы тон, даўжыня — каля 75 метраў. Агрэгат сбалансаваны і ацэнтраваны настолькі дакладна, што калі на падмурак паставіць манету на рабро, то яна не ўпадзе, расказаў **Андрэй ЛАЗОЎСКІ, начальнік турбіннага цэха:**

*— У цыліндр высокага ціску турбіны падаецца свежая пара, якая трапляе на лапаткі турбіны і раскручвае ротар. На адной восі з ротарам турбіны знаходзіцца ротар генератара — такім чынам адбываецца выпрацоўка электраэнергіі. Адпрацаваная пара на выхадзе з турбіны трапляе ў кандэнсатар, дзе ператвараецца ў вадкасць, якая падаграваецца і зноў ідзе ў работу. Для наладкі абсталявання прыкладзена шмат намаганняў. Рэгулюючы клапан нізкага ціску турбіны, маса якога каля 1,5 тоны, настроены так, каб спрацоўваць на закрыццё за 1-1,5 секунды. Такім чынам рэгулюецца магутнасць.*

## Ратавальны дызель

На выпадак аварыйнага адключэння электразабеспячэння прадугледжаны меры па бяспецы энергаблока. Створана дызель-генератарная рэзервовая станцыя, у якой знаходзяцца чатыры дызель-генератарныя ўстаноўкі. Кожная з іх можа выдаваць 6,3 МВт магутнасці, чаго хапае для забеспячэння ўласных патрэб аднаго блока, расказаў **Уладзімір ТАШЧАН, намеснік начальніка электрацэха:**

*— Дзякуючы такой чатырохканальнай сістэме бяспекі ўсе чатыры дызелі пры абястачванні запускаюцца і цягам 12 секунд набіраюць сваю поўную магутнасць. Гэта неабходна найперш для таго, каб падтрымаць у функцыянальным стане ўсе тэхналагічныя сістэмы: рэактарныя ўстаноўкі, вентыляцыю, электразабеспячэнне. Ёсць яшчэ адна ўмова, якая ўзнікла пасля аварыі на АЭС «Фукусіма-1», — для кожнага энергаблока ёсць перасовачная дызель-генератарная ўстаноўка на 500 кВт, якая ў выпадку запраектнай аварыі можа забяспечыць пасіўны адвод цяпла ад рэактара.*

Устаноўка хоць і называецца перасовачнай, нікуды не рухаецца — яна знаходзіцца ў кожным блоку. Падчас эксплуатацыі кожны дызель штомесяц пакручваецца на халастой хадзе, і паралельна праводзіцца аўтаматычны ступеньчаты пуск усіх механізмаў. Такім чынам імітуецца адключэнне электразабеспячэння, і дызель запускаецца (адзін кожны тыдзень). Гэткая ж устаноўка гатовая і для другога энергаблока.



## «Атамныя басейны»

Адно з самых прыгожых месцаў АЭС, падобнае да фантанаў, — пырскальныя басейны. Гэта адзін з аб'ектаў цэха забяспечвальных сістэм, задача якога — даваць станцыі ваду і адводзіць яе. Выгляд фантана басейн мае, каб павялічыць плошчу цеплаабмену для больш эфектыўнага ахаладжвання вады (тэмпература яе пры паступленні каля 20 °С, пасля ахаладжвання — каля 10-11). На кожным басейне — па 48 сопла́ў, якія змешчаны на вышыні два метры над паверхняй вады, а вышыня «фантана» можа дасягаць 14 метраў, расказаў **Васіль КУРБАН, намеснік начальніка цэха забяспечвальных сістэм:**

*— Пырскальныя басейны даўжынёй 120 метраў, шырынёй 30 метраў і глыбінёй 4,4 метра ўмяшчаюць 24 тысячы м³ вады і маюць чатыры каналы, кожны з якіх падзелены на дзве аднолькавыя часткі, каб забяспечыць надзейную і бесперабойную падачу вады. Расход яе ў залежнасці ад надвор'я, вільготнасці, хуткасці ветру і тэмпературы можа быць ад 1700 м³ да 3400 м³ за гадзіну, а ў асабліва складаныя перыяды — дасягаць і шасці тысяч кубаметраў. Ідэнтычныя басейны падрыхтаваны і для другога энергаблока.*

## Рамонт планавы і па запатрабаванні

Ёсць на АЭС і цэнтральныя рамонтныя майстэрні, якія журналісты і наведалі. А вось у майстэрні, якія знаходзяцца на блоках непасрэдна ў зоне кантралюемага доступу (тут выконваюцца работы, звязаныя з абсталяваннем рэактарнага аддзялення), трапіць могуць толькі спецыялісты.

*— На станцыі прадугледжана правядзенне тэхнічнага абслугоўвання і планава-папераджальнага рамонту. Рамонтная кампанія праходзіць цягам 12 месяцаў. Штогод энергаблок павінен спыняцца для частковай перагрузкі паліва, і ў гэты перыяд выконваюцца рэгламентныя работы па дыягностыцы абсталявання і яго рамонту,* — паведаміў **Сяргей БЫЛЬЧЫНСКІ, намеснік галоўнага інжынера па рамонце АЭС.** — *Летась быў выкананы першы планава-папераджальны рамонт станцыі, у якім удзельнічаў як рамонтны персанал станцыі (каля 600 чалавек), так і да 1000 рамонтнікаў з падрадных арганізацый. Генпадрадчыкам на рэактарным аддзяленні выступіла арганізацыя «Русатам Сэрвіс» канцэрна «Расэнергаатам», а рамонт турбіннага аддзялення выканалі спецыялісты арганізацыі «Белэнергарамналадка».*

У майстэрнях станочнага абсталявання, напрыклад, вырабляюць дэталі, неабходныя для рамонту абсталявання турбіннага рэактарнага цэха. А на зварачным участку фарміруюць нарыхтоўкі для выкання аперацый па вырабе неабходнага абсталявання, аснасткі, а таксама зварачныя работы па зборцы гэтых элементаў. Тут жа, калі трэба, рамантуюцца і дэталі з энергаблокаў. У цэху цэнтралізаванага рамонту рамантуецца трубаправодная арматура — выконваецца поўны комплекс работ ад разборкі і дэфектацыі да аднаўлення і выпрабаванняў выкананага рамонту.

БелАЭС спраектавана з улікам пэўнага набору знешніх фактараў. Яна здольная вытрываць землятрус, паводку і нават падзенне самалёта, паколькі спалучае ў сабе актыўныя і пасіўныя сістэмы бяспекі. Такім чынам, праект адпавядае найсучаснейшым патрабаванням і застаецца найбольш запатрабаваным у свеце, паколькі лічыцца самым бяспечным па ўсіх сістэмах абароны, запэўнілі атамшчыкі.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Блізкая ўлада

# РАЁН З БАЯВОЙ НАЗВАЙ

**Партызанскі раён Мінска з'яўляецца адным з самых маладых муніцыпальных утварэнняў горада. У мінулым годзе яму споўнілася 45 гадоў. Аб тым, наколькі важную ролю ён выконвае ў развіцці Мінска, якіх працоўных дасягненняў дамагліся яго прамысловыя прадпрыемствы, як змяняецца сацыяльная інфраструктура, карэспандэнту «Звязды» расказаў кіраўнік адміністрацыі раёна Валерый ВАРАНІЦКІ.**



***— Валерый Віктаравіч, у кожнага раёна Мінска ёсць свая адметнасць, што называецца, свая разынка. У чым, на ваш погляд, заключаецца асноўнае адрозненне Партызанскага раёна ад іншых муніцыпальных утварэнняў сталіцы?***

— Адным з галоўных адрозненняў нашага раёна я лічу наяўнасць вялікай колькасці ўстаноў адукацыі розных тыпаў, частка якіх занятая падрыхтоўкай кадраў для прамысловых прадпрыемстваў горада. А гэта, як разумееце, залог паспяховага эканамічнага развіцця не толькі горада, але і дзяржавы ў цэлым.

Сёння сістэма адукацыі ў раёне налічвае 62 установы ўсіх тыпаў: 29 дашкольных устаноў, 11 сярэдніх школ, дзве гімназіі і спецыяльная школа для дзяцей з парушэннем слыху. На тэрыторыі раёна сярод устаноў агульнай сярэдняй адукацыі хачу выдзеліць спецыялізаваны ліцэй МУС, дзе штогод падрыхтоўку праходзяць будучыя абаронцы і сапраўдныя патрыёты краіны.

У Партызанскім раёне размяшчаецца дзевяць каледжаў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Нашы каледжы рыхтуюць спецыялістаў для асноўных прадпрыемстваў, такіх як Мінскі трактарны завод, маторны, электратэхнічны, «Белкамунмаш». Спецыфіка раёна такая, што прадпрыемствы з'яўляюцца пляцоўкай як для праходжання практыкі, так і для першых працоўных месцаў выпускнікам. Цесна супрацоўнічаем у плане падрыхтоўкі кадраў.

У раёне чатыры вышэйшыя навучальныя ўстановы: акадэмія сувязі, лінгвістычны ўніверсітэт, міжнародны экалагічны інстытут імя А. Сахарава, філіял расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя В. Пляханава. Да пачатку навагa навучальнага года ўведзены ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту новы лабараторны корпус БДУ — інстытут Сахарава, дашкольная ўстанова № 242 на трактаразаводскім пасёлку, сучасны стадыён сярэдняй школы № 87 пасля рэканструкцыі, будынак гандлёвага каледжа таксама пасля капітальнага рамонту.

Асноўнай задачай для сябе бачым стварэнне адпаведных умоў для адукацыйнага працэсу. У раёне сёння вучацца каля 30 тысяч дзяцей, навучэнскай і студэнцкай моладзі. А гэта — наша будучыня!

***— Партызанскі раён — месца засяроджвання флагманаў беларускай прамысловасці і іншых прадпрыемстваў. Які ўклад у эканоміку горада яны ўнеслі па выніках 2022 года?***

— Прамысловы комплекс раёна ў 2022 годзе прадстаўлены 23 прамысловымі арганізацыямі.

За студзень — кастрычнік 2022 года выраблена прамысловай прадукцыі на суму 4184,6 млн руб., або 25 % усіх аб'ёмаў вытворчасці прадпрыемстваў Мінска. Пагадзіцеся, вельмі важкая лічба! Тэмп росту вытворчасці прамысловай прадукцыі адносна мінулага года склаў 140 працэнтаў.

Удзельная вага запасаў гатовай прадукцыі прамысловых арганізацый раёна ў сярэднямесячным аб'ёме вытворчасці на 01.11.2022 склала 67 працэнтаў. Суадносіны экспарту тавараў і аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі прамысловых арганізацый склалі 60,9 працэнта.

Прамысловымі арганізацыямі адгружана інавацыйнай прадукцыі на суму 1768,3 млн руб., удзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў аб'ёме, адгружанай па раёне, склала 45,0 %, або каля паловы адгружанай прадукцыі прадпрыемстваў прамысловага комплексу Мінска.

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ, паслуг у цэлым па раёне за студзень — верасень 2022 г. склала 7159,9 млн руб. з тэмпам росту 130,7 працэнта. У цэлым па раёне на 1.10.2022 атрыманы чысты прыбытак у памеры 383,5 млн руб.

Што датычыцца намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы, то за студзень — кастрычнік яна склала 2171,5 рубля, або 111,8 % да аналагічнага перыяду 2021-га. Дадам, што сярэдняспісачная колькасць работнікаў за студзень — кастрычнік 2022 г. у раёне склала 58 574 чалавекі.

***— Наколькі паспяхова развіваецца сацыяльная інфраструктура раёна? Што зроблена ў гэтым плане за апошні час?***

— Сапраўдным падарункам для жыхароў Партызанскага раёна стала ўвядзенне ў эксплуатацыю новага будынка дзіцячай паліклінікі па вул. Даўгабродскай, 39. Гэты аб'ект мае для нас асаблівую важнасць, больш за 10 гадоў дзеці туліліся ў будынку цэнтральнай раённай паліклінікі № 14. А цяпер у іх цэлы палац, так адзначыў Прэзідэнт нашай краіны, які 3 чэрвеня 2022 года ўрачыста адкрыў дзіцячую паліклініку ў Партызанскім раёне.

У нашым раёне шмат сацыяльных аб'ектаў. Акрамя паліклінік, 6-й гарадской клінічнай бальніцы плануецца будаўніцтва новага прыёмнага аддзялення траўматалагічнага корпуса. Рашэнне Мінгарвыканкама ёсць, праект распрацаваны. Дадам, што да 2025 года будзе ўведзены ў эксплуатацыю гарадскі наркалагічны дыспансер па вул. Карвата.

Жадаем пашырыць магчымасці нашага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва: падабраны дадатковыя плошчы для арганізацыі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў з уладкаваннем майстэрняў па працоўнай рэабілітацыі.

Партызанскі раён мае добрую спартыўную інфраструктуру: гэта цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па плаванні і сінхронным плаванні, спартыўна-юнацкія школы па тэнісе і пяцібор'і. Мы, дарэчы, вельмі ганарымся нашай выхаванкай Арынай Сабаленкай!

У гэтым годзе выкананы капітальны рамонт уваходнай аркі аднаго з любімых месцаў адпачынку мінчан — парку імя Горкага. А развіццё і абнаўленне сеткі гандлю, атракцыёнаў у парку адбываецца ўвесь час.

***— Як у раёне ідзе будаўніцтва жылля? Якія новыя аб'екты ў хуткай будучыні з'явяцца на яго тэрыторыі?***

— Генеральным планам г. Мінска і праектамі дэталёвага планавання ў найбліжэйшай перспектыве прадугледжана будаўніцтва больш як 450 тыс. кв. метраў жылля ў мікрараёне Сцяпянка (у межах вуліц Карвата і Геалагічнай), таксама ў межах вуліц Сталетава, Запарожскай, Філімонава, у мікрараёне трактаразаводскага пасёлка (у межах вуліц Клумава, Шчарбакова, Чабатарова), на вуліцах Захарава і Андрэеўскай.

У 2022 годзе ўведзены ў эксплуатацыю два жылыя дамы (139 кватэр) для шматдзетных сем'яў у раёне вул. Чабатарова, Клумава, Шчарбакова. Працуе камісія па прыёмцы ў эксплуатацыю яшчэ двух жылых дамоў для тых, хто мае патрэбу. З'явяцца новыя дамы ў мікрараёне Дражня — па вул. Солтыса (126 кватэр) і на вул. Андрэеўскай (88 кватэр). Ажыццяўляецца будаўніцтва двух жылых дамоў на камерцыйнай аснове (5 кватэр для шматдзетных) у раёне вул. Карвата, 8а.

***— Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі з'яўляецца паляпшэнне ўмоў жыцця для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Што ствараецца ў гэтым плане?***

— У адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі, інваліды, якія маюць патрэбу, забяспечваюцца тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі. Набыты гусенічны травалатар для перамяшчэння інвалідаў у пад'ездах жылых дамоў, дзе немагчыма стварыць безбар'ернае асяроддзе. У мінулым годзе мы ў шасці дамах абсталявалі пандусы і пад'ёмнікі, два з іх удалося выканаць дадаткова за кошт эканоміі бюджэтных сродкаў.

У тэрытарыяльным цэнтры абслугоўвання насельніцтва адкрыта аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў, а таксама аддзяленне дзённага знаходжання для пажылых грамадзян. Працуюць гурткі і спартыўныя секцыі. Мы з увагай ставімся да праблем і з разуменнем іх вырашаем.

***— Што ў хуткім часе будзе зроблена для павышэння якасці жыцця грамадзян і ўпрыгожвання тэрыторыі раёна?***

— У 2022 годзе для жыхароў Партызанскага раёна абсталяваны дзве экасцежкі ў мікрараёнах «Сцяпянка» і «Дражня». Выдатныя зоны для сямейнага адпачынку і аматараў здаровага ладу жыцця. У 2023 годзе на тэрыторыі раёна УП «Зеляндбуд Партызанскага раёна г. Мінска» будзе працягнута азеляненне і добраўпарадкаванне тэрыторыі.

Акрамя гэтага, будуць наладжаны дзве зоны адпачынку ў парку «Антонаўскі» і ў парку імя А. Герасіменкі. У гэтых зонах для камфортнага адпачынку будуць устаноўлены лаўкі, пабудаваны дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі, устаноўлены МАФ.

Таксама для павышэння эстэтычнага ўзроўню нашай любімай сталіцы і ў рамках кветкавага афармлення раёна дадаткова будуць устаноўлены кветкавыя кашпо на агароджах уздоўж вуліц Ванеева, Даўгабродскай, В. Казлова, А. Кашавога, Ф. Скарыны, Сталетава і С. Ваўпшасава.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

З нагоды

# Юбілейны маршрут

**Віцебшчына з размахам працягвае святкаваць 85-годдзе з дня ўтварэння. Учора ў Віцебскім раёне стартаваў абласны грамадзянска-патрыятычны аўтамарафон «85 гадоў пад небам Віцебшчыны», удзельнікі якога на працягу чатырох дзён будуць падарожнічаць па раёнах паўночнага рэгіёна і знаёміцца з іх славутасцямі і гісторыяй.**



Арганізавалі аўтамарафон галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама і Віцебскі абласны камітэт ГА «БРСМ» пры садзейнічанні раённых і гарадскіх выканаўчых камітэтаў. Удзельнікі юбілейнай акцыі, а іх 11 чалавек, — прадстаўнікі Маладзёжнага парламента, маладзёжнай палаты пры абласным Савеце дэпутатаў, абласнога Савета рабочай моладзі, грамадскіх аб'яднанняў і артысты — на брэндаваным мікрааўтобусе праедуць маршрутамі памяці па 23 раённых цэнтрах і гарадах Віцебшчыны. Дарэчы, пасля чатырохдзённага віражу па прасторах малой радзімы мікрааўтобус з лагатыпам акцыі ў колерах дзяржаўнага флага і QR-кодам будзе курсіраваць па вобласці і ў звычайныя дні.

Дыялогавыя пляцоўкі пройдуць па чатырох кірунках: маладзёжна-грамадскія арганізацыі, маладзёжны парламентарызм, сустрэчы Савета рабочай моладзі з моладдзю рэгіёнаў і «Пад небам Віцебшчыны», якая прадугледжвае зносіны з усімі катэгорыямі насельніцтва. У кожным раёне пройдуць канцэртныя праграмы лепшых мясцовых творчых калектываў, а яшчэ моладзь возьме ўдзел у чэленджы «85», крэатыўна прадставішы юбілейнае чысло. Збіраць часткі гісторыі асобных рэгіёнаў удзельнікі аўтамарафону будуць у выглядзе элементаў карты паўночнага рэгіёна, прэзентацыя якой адбудзецца 17 лютага ў рамках цырымоніі ўзнагароджання «Чалавек года Віцебшчыны».

«Мы рады, што абласны аўтамарафон стартаваў менавіта ў Віцебскім раёне, на гэтай багатай гістарычнай зямлі. На яе долю выпала нямала трагічных падзей Вялікай Айчыннай вайны, 10 месяцаў тут стаяў фронт. Галоўная задача маладога пакалення сёння — вынесці горкі ваенны ўрок і не дапусціць паўтарэння страшных падзей 1940-х. Аб гэтым, а таксама аб дасягненнях і вядомых людзях раёнаў будзе ісці гаворка ў межах дыялогавых пляцовак», — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Марына НАВІЦКАЯ.**

**Старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар ДАРОЖКІН** прапанаваў удзельнікам мерапрыемства старонкі летапісу Прыдзвінскага краю, азнаёміў з найбуйнейшымі прадпрыемствамі-флагманамі, якія фарміруюць моцную эканамічную базу раёна. Сярод іх — ААТ «БелВітунiфарм», якое выпрабляе больш за 150 найменняў ветэрынарных прэпаратаў і кампанія «Белфуд Прадакшн», — вытворца дзіцячага харчавання пад вядомым брэндам «Маленькае шчасце». Віктар Васілевіч перадаў кіраўніцтву вобласці першы пазл карты і пажадаў аўтамарафону лёгкай дарогі.

Наступным пунктам маршруту стаў Лёзненскі раён — радзіма такіх выдатных дзеячаў літаратуры і мастацтва, як Аляксандр Рыпінскі, Міхась Лынькоў, сусветна вядомы мастак Марк Шагал лічыў Лёзна сваёй малой радзімай, родам з гэтых мясцін і старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка.

У сярэдняй школе № 1 гарадскога пасёлка Лёзна прайшлі чатыры дыялогавыя пляцоўкі і святочны канцэрт, на якім гучалі пажаданні росквіту, міру і поспехаў на адрас роднай Віцебшчыны. Удзельнікаў аўтамарафону на лёзненскай зямлі вітала Тамара Дзмітрыеўна Дзядкова — заслужаны педагог і культработнік, якая прысвяціла рабоце ў раёне 66 гадоў. Для перадачы пазла карты маладому пакаленню Тамара Дзмітрыеўна была абрана невыпадкова: яна таксама нарадзілася 15 студзеня і старэйшая за вобласць на год! За плячыма ў жанчыны яркія і насычаныя гады жыцця: у 60-я песня «Рушнікі» ў выкананні дуэта Тамары Дзядковай і Валянціны Альхоўк праславілася на ўвесь Савецкі Саюз, выканаўцы ездзілі ў Маскву для запісу дакументальнага фільма — у сучасным разуменні першага відэакліпа. Яе дзецішча — знакаміты дзіцячы фальклорны ансамбль «Прасніца», які існаваў больш за 20 гадоў. Нягледзячы на ганаровы ўзрост, Тамара Дзмітрыеўна і сёння не страціла звонкі голас, дагэтуль спявае ў народным клубе «Ветэран». Звяртаючыся да ўдзельнікаў аўтамарафону, яна пажадала моладзі імкнення да новага і вялікага, міру і яснага неба над галавой, аб цане якога ведае не па чутках.

Учора аўтамарафон таксама наведаў Дуброўна і Оршу, сёння на карце патрыятычнага маршруту адзначаны Талачын, Сянно, Чашнікі, Бешанковічы і Ушачы. Наперадзе — яшчэ два займальныя дні, чым будуць напоўнены яны — ёсць магчымасць убачыць у відэадзённіках юбілейнай акцыі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

**Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца**

# «...ЗАДАЛІСЯ МЭТАЙ ПЕРАТВАРЫЦЬ ЧЭРЫКАЎ У ПУСТЫНЮ»

**ЧЭРЫКАЎ падчас акупацыі быў цэнтрам акругі, у які ўваходзіла 10 раёнаў сучасных Магілёўскай, Гомельскай і Смаленскай абласцей. Знішчэннем насельніцтва тут займалася некалькі акупацыйных устаноў. Дагэтуль Васіль Максіменка па крупінках вышуквае інфармацыю, каб разабрацца ў заблытаных трагічных гісторыях расправы з мірным насельніцтвам. Асабліва жорстка тут абыходзіліся з яўрэямі, на іх было аб'яўлена сапраўднае паляванне. Сёння пра гэтыя жахлівыя часы нагадваюць помнікі, але на іх толькі частка імёнаў. Васіль Максіменка сабраў шмат новага матэрыялу пра падзеі тых часоў, знайшоў сотні новых прозвішчаў, якія не былі ўлічаны. Летась, напрыклад, ён удакладніў інфармацыю па вёсках Рагаліна, Бакуновічы і Сененка. Інфармацыя пра іх была, але не поўная і часам супярэчлівая. Злавесную ролю ў лёсе вёсак сыгралі здраднікі з ліку мясцовых.**

## Мясцовы краязнаўца, пошукавік, гісторык Васіль Максіменка штогод адкрывае новыя факты аб зверствах фашыстаў на тэрыторыі раёна

## ТЭМА ГЕНАЦЫДУ — НЕВЫЧЭРПНАЯ

— Сёння не тайна, што былі выпадкі, калі пад выглядам партызан насельніцтва знішчалі паліцаі, — кажа даследчык. — На Чэрыкаўшчыне так было з Бакунавічамі. Мясцовыя жыхары расказвалі, што тыя былі вельмі вынаходлівыя ў сваіх здзеках: рабавалі, гвалтавалі, забівалі..

Васіль Максіменка — гісторык, краязнаўца, педагог, кіраўнік чэрыкаўскай пошукавай групы «Звязда», якая працуе ў складзе Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру». За час педагагічнай дзейнасці стварыў на Чэрыкаўшчыне чатыры музеі — у вёсцы Вепрын, дзе працаваў настаўнікам гісторыі, два музеі — этнаграфічны і гісторыка-краязнаўчы — у сярэдняй школе № 1, а таксама «Помніць СССР» — на базе Чэрыкаўскага цэнтра дзіцячага і юнацкага турызму, краязнаўства і экскурсій. Ён жа аўтар трох кніг: «Гістарычны інтэр'ер Чэрыкава і яго наваколля», «Нарыс гісторыі і прыроды Чэрыкаўскага краю» і «Чэрыкаўскае Прысожжа: погляд у мінулае і сучаснае». Член раённай камісіі па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» Чэрыкаўскага раёна. Працаваў у Дзяржархіве Расійскай Федэрацыі, Нацыянальным архіве Беларусі, ізраільскім архіве Яд ва-Шэм. Дзякуючы пошукавай і архіўнай дзейнасці ўстанавіў больш чым 300 прозвішчаў ахвяр вайны. Кажа, што матэрыялу цалкам хапае на стварэнне новай кнігі пра вайну.

— Гэта тэма для мяне святая, — кажа ён. — Мой бацька — Стэфан Макаравіч — франтавік, ваяваў, быў цяжка паранены ў баях на Проні пад Чавусамі. Дзед Макар Сямёнавіч там жа знік без звестак. Спадзяюся, што атрымаецца даведацца пра яго лёс. Тэма генацыду адна з балючых. Гэтую работу вяду з савецкіх часоў, калі працаваў настаўнікам, неаднаразова ездзіў у Падольскі архіў Мінабароны Расійскай Федэрацыі, вывучаў інфармацыю па сельсаветах, апытваў грамадзян. Тэма невычэрпная. За час акупацыі



ў раёне было спалена часткова або поўнасцю 82 населеныя пункты, расстраляна і закатавана больш за паўтары тысячы чалавек. На прымусовыя работы ў Нямеччыну фашысты вывезлі больш чым 450 жыхароў раёна.

## АПОШНІ ДЗЕНЬ СЕНЕНКІ

Маленькая вёсачка, дзе было ўсяго шэсць двароў, прыпыніла сваё існаванне 20 сакавіка 1942 года. На тэрыторыі раёна гэта быў першы цалкам спалены населены пункт.

— Было некалькі меркаванняў наконт таго, што стала прычынай карнай аперацыі, — расказвае Васіль Максіменка. — Расстраляць, спаліць, закатаваць маглі за сувязь з партызанамі. Але тут крыху іншая гісторыя. І ў ёй замешаны былы партызан, а пасля — памагаты акупантаў Фёдар Бравы.

Здраднікі з ліку сваіх былі найбольш небяспечнымі і вераломнымі, асабліва калі валодалі сакрэтнымі звесткамі пра тых жа падпольшчыкаў. Перад тым як пагадзіцца працаваць на акупацыйны рэжым, Фёдар Бравы ваяваў у Чэрыкаўскім партызанскім атрадзе, якім камандаваў сакратар падпольнага райкама партыі Георгій Храмовіч, чалавек для раёна легендарны, мужны і самаахвярны. Шмат чаго зрабіў для вызвалення Чэрыкаўшчыны.

— Ён ведаў Фёдара Бравага з лепшага боку, у атрадзе нават наблізіў яго да сябе, — расказвае суразмоўнік. — Па інфармацыі Храмовіча, баец дзейнічаў смела, быў добрым разведчыкам. З біяграфіі Бравага ён ведаў, што той быў ураджэнцам Сталінграда, пэўны час працаваў назіральнікам у турме.

Падчас разгрому атрада Фёдар Бравы быў схоплены і трапіў у гестапа. Там ён не вытрымаў катаванняў і здаў амаль усіх падпольшчыкаў, якіх ведаў. Па яго звестках былі арыштаваныя і пакараныя 17 чалавек Дубраўскай падпольнай арганізацыі. Ён жа здаў і кіраўніка Вепрынскай падпольнай арганізацыі Васіля Боміхава, які хаваўся ў сваёй знаёмай у вёсцы Сененцы. Паляванне на падпольшчыка і стала прычынай знішчэння вёскі.

Гітлераўцы прыбылі ў Сененку раніцай 20 сакавіка 1942 года і адразу ж акружылі дамы. У вёсцы пражывалі 21 чалавек, 14 з іх былі расстраляныя. Паліцаі па загадзе немцаў выганялі людзей на вуліцу, а дамы падпальвалі. Васіля Боміхава, які пачаў адстрэльвацца, ранілі і захапілі ў палон. Але перад гэтым ён паспеў забіць немца і параніць двух паліцаяў. Яго вывезлі ў Чэрыкаў, пасля катаванняў расстралялі непадалёк ад горада.

Пра тую страшную раніцу Васілю Максіменку расказвала ў 1990-я гады жыхарка вёскі Ганна Віктараўна Падабед, якая цудам пазбегнула смерці:

*«Страшна ўспамінаць, як у нашу Сененку прыляцеў карны атрад. Прашамацелі па суседніх пасёлках Багунаўцы, Лысаўцы. За дапамогу партызанам арыштавалі дзвюх дзяўчын, Паўла Ісачанку, жонку Антона Юдзянкова і іншых. У адну хату сабралі ўсіх і паліцая з немцам пільнаваць прыставілі. А адзін немец з перакладчыкам павезлі ў лес дырэктара школы Івана Попеля з сынам. Туды ж потым і іншых арыштаваных з хаты забралі і ўсіх расстралялі. Людзей сагналі глядзець на расправу. Жах: няшчасных людзей білі прыкладамі да крывавага месіва, а потым пускалі ў іх кулю. Крыкі іх і зараз чую.*

*А пасля расстрэлу паліцаі хадзілі па хатах, і немец пагражаў, што іх падпаляць. І хаты пыхкалі як свечкі, хоць вакол ляжаў снег. Калі ў каго хлеў ацалеў або склеп — шчасце. Бульба і зерне пагарэлі. Людзі крычалі і плакалі. Скацінка да іх ціснулася і дрыжала. Змітрок Асмалоўскі, у якога часта знаходзіліся партызаны, схаваўся ў падпечку і застаўся жывы. Хатку яго патушылі. Дапамог Бог добраму чалавеку. Увесну адбудоўваліся людзі, як маглі».*

Змітрок Асмалоўскі — стараста вёскі. Захаваліся ўспаміны Георгія Храмовіча, які ўспамінае яго як чалавека, які дапамагаў партызанам і падпольшчыкам зброяй і прадуктамі харчавання. *«Гэта быў стараста, звязаны з райкамам партыі да таго, як яго разграмілі. Яго дом падпалілі, а ён схаваўся пад падлогай. Людзі патушылі пажар, і ён выратаваўся»,* — пісаў Храмовіч.

У сваёй кнізе ён таксама згадвае, што абавязкі старасты Сененкі выконваў і Антон Апанасавіч Юдзянкоў, які забяспечваў партызан харчаваннем, адзеннем і абуткам і не выконваў распараджэнняў акупантаў па здачы збожжа, мяса і іншых падаткаў. Пасля нямецкай расправы вёска больш не аднавілася, цалкам знікла з карты раёна.



Падпольшчыкаў выдавалі здраднікі.

**З кнігі «Памяць» Чэрыкаўскага раёна**

*«...У верасні 1943 года гітлераўцы спалілі вёскі Бакаў, Гойкаў, Гарадзец, Міхалін, Прыпёчына, Рагаліна, Сакалоўку, Таржоў, Шароеўку. Амаль кожная вёска на Чэрыкаўшчыне ў гады акупацыі стала вогненнай. Беліца, Багданаўка, Вінаград, Вымач, Грыўкі, Язёры, Ялоўка, Заазер'е, Звязда, Карма, Крывая Слабада, Латышчына, Маёраўшчына — усяго 26 вёсак, дзе былі часткова спаленыя дамы і забіта насельніцтва».*

## ПАЛІЦАІ ПАД ВЫГЛЯДАМ ПАРТЫЗАН

Калі Васіль Максіменка толькі пачынаў займацца тэмай генацыду і працаваў у архіве ЗАГСа Чэрыкаўскага райвыканкама, ніяк не мог уцяміць, чаму насупраць прозвішчаў жыхароў вёскі Бакунавічы напісана — «забіты партызанамі». У спісе было 32 чалавекі, у тым ліку дзеці. Пачаў раскручваць тэму, апытваць насельніцтва і хутка зразумеў, у чым справа. Аказалася, што на тэрыторыі раёна, у прыватнасці ў Бакунавічах, пад выглядам партызанскага атрада дзейнічалі паліцаі.

— Немцамі спецыяльна рабіліся такія групы, — кажа ён. — Плануючы акцыю ў Бакунавічах, яны нават дату выбралі святочную для савецкіх грамадзян — 7 лістапада.

Бяда здарылася ў 1942 годзе. Па загадзе немцаў паліцаі, пераапранутыя ў партызан, уварваліся ў вёску і прыступілі да выканання свайго жудаснага крывавага сцэнарыя. Яны выводзілі жыхароў у двор і расстрэльвалі, а дамы спальвалі. Гэта быў першы прыклад масавай расправы з мясцовым насельніцтвам акупантаў.

Па звестках, якія захоўваюцца ў электроннай базе даных Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь «Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны», у Бакунавічах у той дзень, 7 лістапада 1942 года, было спалена 95 дамоў са ста і забіта 32 чалавекі з 380.

— Перад карнай аперацыяй вёску бамбілі, — удакладняе даследчык. — Усе, з кім я размаўляў, расказвалі пра гэта. Як высветлілася, тут дзейнічаў партызанскі атрад «За Радзіму», які потым перарос у брыгаду «Перамога». Фашысты такім чынам распраўляліся з сем'ямі партызан.

## НА ДРУГІ ДЗЕНЬ ПАСЛЯ ХАТЫНІ

Жыхароў вёскі Рагаліна расстрэльвалі тройчы. Першыя былі пакараныя 26—27 чэрвеня 1942 года. Усе яны ўваходзілі ў падпольную групу, створаную былым дырэктарам мясцовай школы Васілём Гапеевым. Падпольшчыкі былі арыштаваныя па даносе здрадніка Якава Калінкіна. Калі іх вялі на расстрэл, выратавацца змог толькі Гапееў.

— Я размаўляў са сведкам, на вачах якога гэта адбылося, — расказвае Васіль Максіменка. — На той час ён быў хлапчуком, пасвіў разам з таварышам кароў. Яны бачылі, як людзей вялі на расстрэл, раптоўна адзін з іх пабег, і па ім пачалі страляць. Гэта і быў Гапееў, яго, як потым высветлілася, толькі крыху паранілі. Пасля гэтага ён стварыў яшчэ адзін партызанскі атрад, які называўся «Трынаццаць». Гэты атрад пасля зліўся са Слаўгарадскім партызанскім атрадам, дзе Гапееў быў прызначаны камісарам.

Другая група рагалінцаў была расстраляная 3 верасня 1942 года. Сярод пакараных былі зусім маладыя, у прыватнасці дваццацігадовы настаўнік Аляксей Алесаў.

А 28 сакавіка 1943 года, на наступны дзень пасля Хатыні, карнікі лютавалі ў вёсцы на поўную сілу. У той дзень на вуліцы Рагаліна быў забіты адзін з паліцаяў, які раздаваў нарады на работу. Яго таварыш паведаміў пра гэта ў гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы Язёры, і адтуль прымчаліся ў вёску карнікі на конях. Прыехалі і паліцаі з Рынкаўскага гарнізона. Як казалі відавочцы, якія выжылі, вёска напоўнілася здраднікамі з бела-чырвона-белымі павязкамі на рукавах.

Усіх жыхароў сагналі да сямігадовай школы, збіраліся там спаліць. Аднак у апошні момант з Чэрыкава прыехалі немцы і прынялі іншае рашэнне. Людзей расстрэльвалі сем'ямі разам з дзецьмі, некаторым малым не было года.

**З успамінаў відавочцы Надзеі Нямцовай:**

*«Пасля таго, як у вёсцы забілі паліцая, з гарнізонаў у Язё-*



*рах і Рынкаўцы наехала шмат паліцэйскіх. Арыштавалі майго бацьку, маці, незамужнюю цётку, сястру бацькі, якая жыла з намі, і бабулю 80 гадоў. Забралі і нас, траіх дзяцей. Усіх сагналі ў цэнтр, дзе раней знаходзіўся клуб. У той час там стаяла школа. Потым прыехала нямецкая машына, і нам сказалі, каб жанчыны і дзеці ішлі па дамах, а мужчыны засталіся каля школы. Маці пасадзілі на адну фурманку з бабуляй. Затым забралі на іншую падводу бацьку, а цётка засталася каля школы. Немцы выбралі 9 чалавек, павезлі іх па старой дарозе на Чэрыкаў і ва ўрочышчы Бутчына расстралялі. Астатніх мужчын адправілі ў Язёры. Нас, траіх дзяцей, загналі ў хатку, а бацьку, маці, бабулю і цётку пакінулі ў казарме. Там жа былі Варка Галайда*




*і Ніна Майсеенка з груднымі дзецьмі. Бацьку майго білі, заганялі іголкі ў пальцы, знялі боты і забілі за казармай. Паліцаі не дазволілі забраць ягонае цела. А маці, цётку Вольгу Гапееву і бабулю расстралялі каля Святога возера.*

*Перад гэтым мяне і двух братоў — самаму малодшаму было толькі тры годзікі — паліцай падвёў да казармы, дзе стаяла мама. У яе быў разбіты ўвесь твар. Яна нас абняла, пацалавала, і яе забралі двое паліцаяў, а нам сказалі: «Ідзіце дадому...»*

Адну групу сяльчан расстралялі перад Язёрамі, другую — ва ўрочышчы Бутчына. Дакладна не вядома, колькі загінула жыхароў Рагаліна, мяркуецца — каля 60 чалавек. Вёска была спалена да апошняга дома ў верасні 1943 года.

**Кніга «Памяць» Чэрыкаўскага раёна. З успамінаў Еўдакіі Саўкінай:**

*«...Схапілі таксама майго бацьку Якава Іванавіча, разам з іншымі яго расстралялі пад Язёрамі. Пазней нашы жанчыны даведаліся аб месцы расстрэлу нашых вяскоўцаў. Трэба было ж загінулых пахаваць. Хоць гэта магло каштаваць жыцця. Употай дабраліся да магілы, лепш сказаць, да ямы. Без рыдлёвак, рукамі адкопвалі сваіх блізкіх, выцягвалі іх на паверхню. Сярод жанчын я была самая маладая, нягледзячы на страх перад немцамі, нябожчыкамі, выкапала, пазнала свайго бацьку. На чацвёрты дзень пасля расстрэлу жыхары вёскі павезлі загінулых на калёсах на вясковыя могілкі. Немцы і паліцаі, даведаўшыся пра гэта, пачалі з Язёр абстрэльваць могілкі. Цяжка знайсці словы, каб перадаць жудаснасць ваеннага часу. Не дай бог, каб некалі гэта паўтарылася...»*

## ЗДЗЕКАМ НЕ БЫЛО МЯЖЫ

У Чэрыкаўскім раёне вялася поўнамаштабная работа па знішчэнні насельніцтва. Падпольшчыкаў і тых, хто спачуваў партызанам, расстрэльвалі, вешалі, спальвалі. Дагэтуль невядомымі застаюцца дзясяткі, сотні імёнаў...

**З акта аб зверствах нямецкіх захопнікаў у Чэрыкаве:**

*«...Зарэгістраваны шматлікія факты здзекаў фашыстаў з жанчын і дзяўчат, якіх нямецкія салдаты публічна гвалтавалі на вачах у людзей на плошчах і вуліцах...*

*...Немцы выкарыстоўвалі мясцовае насельніцтва для размініравання мінных палёў, якія пакідала пасля сябе Чырвоная Армія. Немцы звязвалі калгаснікаў ланцугамі і гналі перад сабой. У выніку гэтага падарваліся на мінах калгаснікі Фрол Отчаў, Міхаіл Шрамаў і шматлікія іншыя...*

*... Здзекам немцаў не было мяжаў. Зімой 1941 года яны сагналі болей чым 400 калгаснікаў і гараджан на будаўніцтва моста праз Сож. Нямецкаму афіцэру падалося, што работы ідуць марудна, і ён прымусіў грамадзян распрануцца нагала і легчы на снег. Усе без выключэння былі збіты...*

*...Асабліва па-зверску распраўляліся фашысты з ваеннапалоннымі, выпрабоўвалі іх голадам. Цалкам галодных, змучаных людзей яны пагналі з Чэрыкава ў Чавусы за 40 кіламетраў. Тых, хто падаў, заколвалі штыкамі. У дарозе загінула 73 чалавекі...*

*...З першага дня нямецкія вылюдкі пачалі сістэматычна знішчаць насельніцтва. Ад адзіночных расстрэлаў паступова перайшлі да масавых. Так, напрыклад, у*



Помнік на месцы расстрэлу.

*кастрычніку 1941 года гітлераўцы аб'явілі аб перасяленні ўсяго яўрэйскага народа горада ў іншае месца. З гэтай мэтай каля 500 яўрэяў былі сагнаныя да народнага дома. Пасля гэтага іх прыгналі ва ўрочышча Маставое, што каля млына, і расстралялі...».*

Васіль Максіменка ў сваіх кнігах, дзе размова ідзе пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, неаднаразова расказвае пра расстрэльныя месцы, якія існавалі на тэрыторыі раёна.




Недалёка ад Чэрыкава, за мостам праз раку Сож, знаходзіцца мемарыял мясцовым жыхарам. У 1978 годзе ветэраны Захар Прасянцоў і Георгій Сотнікаў звярнуліся ў райкам партыі з просьбай, каб на месцы расстрэлу падпольшчыкаў, партызан, разведчыкаў і мірных жыхароў быў устаноўлены помнік. Перад гэтым Сотнікаў напісаў ліст у раённую газету, дзе паведаміў, што за мостам праз Сож, па дарозе Чэрыкаў — Краснаполле, на краі лесу ў гады нямецкай акупацыі былі спрэс могілкі расстраляных людзей. Фашысты забаранялі прыбіраць целы пакараных, іх разрывалі драпежныя звяры і птушкі, зносіла вясновымі паводкамі. Толькі некаторыя з іх мясцовыя жыхары змаглі таемна забраць і пахаваць на могілках.

*«Жудасная карціна была на тым месцы, — сведчыў ветэран. — Мінула каля трыццаці гадоў, але яно ніяк не пазначана. У іншых месцах, дзе былі расстраляныя нашы грамадзяне, устаноўлены помнікі. А тут нябожчыкі, якія загінулі ад рук здраднікаў і фашыстаў, яшчэ чакаюць увекавечання... Месца расстраляных людзей — узлесак Ліменскага лясніцтва, квадрат № 2, паблізу дарогі Чэрыкаў — Краснаполле».*

Па прыблізных звестках тут было забіта каля 268 чалавек.

— Асабіста я праз архівы ўстанавіў імёны 52 чалавек, якія дагэтуль нідзе не былі ўлічаныя, — сведчыць Васіль Стэфанавіч. — Месца прыкметнае, абочына старой Гронаўскай дарогі. Першым тут расстралялі Ісаака Шэрмана 3 студзеня 1942 года. Яшчэ адно трагічнае месца — па дарозе на Крычаў у раёне торфараспрацовак. Там 7 лістапада 1941 года забілі па розных даных ад 300 да 500 яўрэяў. Іх сабралі каля народнага дома пад выглядам, што перасяляюць на новае паселішча, павялі ў бок гэтага месца і расстралялі. Увогуле, за час акупацыі на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна з улікам новых даных было знішчана больш чым дзве тысячы чалавек.

**З акта аб зверствах нямецкіх захопнікаў у Чэрыкаве:**

*«...Напярэдадні свайго адступлення фашысцкія варвары падпалілі Чэрыкаў. З 839 збудаванняў засталося толькі 23. Былі ўзарваныя і згарэлі тры школы, ветэрынарны тэхнікум, аўташкола, народны дом, лесапільны завод, дзве бальніцы, лазня, леспрамгас, райхарчпрам, дзве хлебапякарні, райкам, райвыканкам і іншыя пабудовы...*

*...Адступаючы пад націскам Чырвонай Арміі, немцы ў вар'яцкай лютасці задаліся мэтай ператварыць Чэрыкаў у пустыню. Тых, хто не хацеў сыходзіць з дому альбо спрабаваў схавацца ў лесе, забівалі ці жывымі кідалі ў агонь. Так загінулі Васіль Шынкароў, Раман і Ефрасіння Старавойтавы і іншыя...».*

Сцяг БССР быў зноў узняты над Чэрыкавам 1 кастрычніка 1943 года. Чэрыкаўскі раён вызвалялі войскі Бранскага фронту, непасрэдна Чэрыкаў — часці 413-й Далёкаўсходняй стралковай дывізіі 50-й арміі Бранскага фронту ва ўзаемадзеянні з 15-м і 720-м партызанскімі атрадамі і часткова сіламі партызанскага палка «Трынаццаць». У вызваленні раёна таксама прынялі ўдзел воіны 283-й, 324-й і 385-й стралковых дывізій. За плячыма чырвонаармейцаў 50-й арміі заставаліся сотні кіламетраў баявога шляху, вызваленыя Калужская, Арлоўская, Бранская вобласці, усходнія раёны Магілёўшчыны. У аператыўнай зводцы Саўінфармбюро на ўвесь Савецкі Саюз у гэты дзень прагучала: «1 кастрычніка на Магілёўскім напрамку нашы войскі, працягваючы развіваць наступленне, авалодалі горадам Чэрыкавам, а таксама занялі 340 другіх населеных пунктаў, сярод якіх райцэнтр Магілёўскай вобласці Краснаполле...»

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*г. Чэрыкаў.*
**Фота аўтара.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов: Лот № 1 – капитальное строение, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Ленинская, 2** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
| **Здание банка** (здание административно-хозяйственное) общей площадью 2479 кв. м, инвентарный номер 330/С-11218. Составные части и принадлежности: подвал, крыльцо. **Обременение:** аренда (281,01 кв. м). Подробная информация у Продавца | **2 060 754,00** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 341500000001000141:** предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания отделения ОАО «Белпромстройбанк» общей площадью 0,1636 га | |
| **Лот № 2 – капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Советская, 19** | |
| **Здание банка** (здание специализированное финансового назначения) общей площадью 765,4 кв. м, инвентарный номер 443/С-883. Составные части и принадлежности: подвал, кирпичная пристройка, кирпичный гараж, дорожка, борты, подпорная стена, покрытие | **613 713,60** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 425650100001003926:** предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов административного назначения (для содержания и обслуживания административного здания) общей площадью 0,0606 га | |
| **Дополнительная информация по лотам №№ 1, 2:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Передача покупателю предмета электронных торгов происходит в течение 10 рабочих дней после полной оплаты | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 %** от цены продажи лота № 1 **и 1 %** от цены продажи лота № 2 | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов: 10.00 **13.03.2023.** Окончание торгов: 12.00 **13.03.2023**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.03.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

# ЗНАЙСЦІ СВАЕ КАРАНІ

## Запыты ад беларусаў на правядзенне генеалагічных даследаванняў вылічваюцца тысячамі



Па словах **дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Алега ВОІНАВА,** асноўная маса запытаў, вядома, ад беларусаў. Потым па колькасці ідуць расіяне. А далей — грамадзяне Польшчы, Ізраіля, ЗША. Гэта ў асноўным тыя грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія выехалі 20—30 гадоў таму і шукаюць сваіх бабуль, прабабуль, дзядуляў. Наогул, запыты на генеалагічныя даследаванні паступаюць з больш як 100 краін свету. Калі быць дакладнымі, прадстаўнікі 121-122 краін звяртаюцца па даследаванні», — сказаў Алег Воінаў. Ён удакладніў, што размова ідзе аб звестках за апошнія 10 гадоў.

Гаворачы аб тым, наколькі ўдаецца задаволіць запыты, дырэктар дэпартамента заўважыў, што гэта складаная работа, але супрацоўнікі архіваў, з'яўляючыся прафесіяналамі, паспяхова з ёй спраўляюцца. «Нехта хоча на шэсць пакаленняў паглыбіцца, нехта — больш. Мы можам недзе на 2-3 пакаленні, можа, на 3-4. Але ў цэлым ні адзін запыт не застаецца без увагі», — удакладніў ён.

Зрэшты, заўважыў Алег Воінаў, запыт на такія даследаванні большы, чым магчымасці. «Ахвотных атрымаць сваё генеалагічнае дрэва намнога больш, чым мы можам забяспечыць. Таму мы запрашаем самім паўдзельнічаць у гэтым працэсе», — дадаў ён.

На калегіі, якая праходзіць у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, падводзяць вынікі работы дзяржаўных архіўных устаноў за 2022 год. Асаблівая ўвага — дасягненням юбілейнага года архіўнай галіны. Таксама будуць абазначаны перспектывы дзейнасці беларускіх архівістаў на 2023 год. Прадстаўлена выстаўка «Край мужнасці і славы», прысвечаная партызанскаму руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего**

## ОАО «Булочно-кондитерская компания «Домочай»

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации»,** 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

**Аукцион состоится 10 марта 2023 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, пер. Комиссариатский, 5.**

**Предмет аукциона**
(наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1 – ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ с инвентарным номером 702/D-6017,**
общей площадью 49,4 кв. м,
расположенное по адресу:
Могилевская обл., Быховский р-н, г. Быхов,
ул. Богдана Хмельницкого, 2А-1.

Начальная цена продажи – 22 200 р. 00 к. (без учета НДС).

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 6 марта 2023 года до 17.00.**

Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах**
Могилевского областного исполнительного комитета **www.mogilev-region.gov.by**,
Могилевского городского исполнительного комитета **www.mogilev.gov.by.**

УНП 700008710

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
**ОАО «Борисовхлебпром»** (Продавец)

Аукцион состоится **01.03.2023** в **11.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1, состав:**

**1.** Здание производственного корпуса, инв. № 620/С-33108, 1084,7 кв. м.
**2.** Здание проходной, инв. № 620/С-33107, 25,8 кв. м.
**3.** Здание гаражей, инв. № 620/С-33106, 140,8 кв. м.
**4.** Здание склада, инв. № 620/С-33104, 339 кв. м.

Адрес Лота № 1: **Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1, 1Е**

Земельные участки:
1. 622250100001002286, 0,7179 га;
2. 622250100001005522, 0.0482 га.

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 694 624,56 руб.
Задаток – 69 462,46 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона, – **ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **27.02.2023 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2023.Б.002.00020

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска.

**Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества**

**Лот № 1. Недвижимое и движимое имущество. Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения (№ 2/01-2023).**

Кап. строение с инв. № 500/С-22830 площадью 1945,0 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/31, наименование: агломерационное отделение, назначение: здание неустановленного назначения, инв. № 12 включает номера 130, 131, 132, 133, 14. 135, 13. Кап. строение с инв. № 500/С-22839 площадью 816 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/30, наименование: шахтосмесительное отделение, назначение: здание специализированное для производства строительных материалов, инв. № 11. Кап. строение с инв. № 500/С-22829 площадью 850 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/29, наименование: приемное отделение цеха аглопорита, назначение: здание специализированное для производства строительных материалов, инв. № 10. Кап. строение с инв. № 500/С-67304 площадью 24,7 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/51, наименование: здание кладовой; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 400494. Вышеуказанные кап. строения расположены на зем. участке с кадастровым № 500000000006004407 площадью 4,3601 га по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (общее долевое право постоянного пользования). Покупателю переходит доля в праве постоянного пользования зем. участка с кадастровым № 500000000006004407 из расчета площади для обслуживания объектов 31872 кв. м. Преобразователь частоты TOSHIBA VF-P7 160 КВт, инв. № 501002, преобразователь частоты VF-S11 TOSHIBA 15 КВт, инв. № 501083, преобразователь частоты TOSHIBA160 КВт VF-P7, инв. № 500956, кабельная линия ЛЭП-10 КВ ТП-3086, инв. № 205, высоковольтная кабельная линия ОТ п/СТ 0-12, инв. № 204, кирпичная труба дымовая (материалы), система пожарной сигнализации, инв. № 501360, находящиеся по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47.

**Начальная цена:** 1 274 530,00 бел. руб. без НДС.

**Минимальная цена:** 1 019 624,00 бел. руб. без НДС.

**Дополнительное условие по лоту № 1:** Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение движимого имущества на общую сумму **182 311,08** бел. руб. без НДС, находящегося по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47, ознакомиться с перечнем имущества можно на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/.

**Лот № 2. Недвижимое и движимое имущество. Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения (8/07-2022).**

Кап. строение с инв. № 500/С-48493 площадью 113 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра,47/18, наименование: здание ТП 3084, назначение: здание специализированное энергетики, инв. № 100010 находящееся на зем. участке с кадастровым № 500000000006004362 площадью 16,0587 га по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (общее долевое право постоянного пользования). Покупателю переходит доля в праве постоянного пользования зем. участка с кадастровым № 500000000006004362, из расчета площади для обслуживания объектов 690 кв. м. Комплекс вводных щитов ГПА линии № 2, инв. № 501233 по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47.

**Начальная цена:** 47 000,00 бел. руб. без НДС.

**Минимальная цена**: 37 600,00 бел. руб. без НДС.

**Дополнительное условие по лоту № 2:** Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение движимого имущества на общую сумму **5905,36** бел. руб. без НДС: находящегося по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47, ознакомиться с перечнем имущества можно на электронной торговой площадке по электронному адресу **http://etpvit.by.**

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение торгов и оплатить услуги оператора ЭТП; возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов и заключить договор купли-продажи движимого имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договоров купли-продажи; демонтаж, погрузка и вывоз имущества осуществляется за счет Покупателя в срок, указанный в договоре купли-продажи.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Дата и время начала и завершения электронных торгов: **13.03.2023 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by **по 16.00 10.03.2023.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 10.03.2023.**

**Задаток по лоту № 1** в сумме **127 453,00** (сто двадцать семь тысяч четыреста пятьдесят три рубля 00 копеек) белорусских рубля, **задаток по лоту № 2** в сумме **4 700,00** (четыре тысячи семьсот рублей 00 копеек) белорусских рубля должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, код операции 40901.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Справочная информация.

Контактный телефон антикризисного управляющего: +375 17 374 23 93.

Контактный телефон для осмотра объектов: по лоту № 1: +375 44 793 73 06, по лоту № 2: +375 44 7936318.

Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) в рабочих дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества (г. Минск, ул. Я. Мавра, 47).

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на **http://etpvit.by** до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

# ДАСТАЕЎСКІ — НЕ ІКОНА ДЛЯ СУЧАСНЫХ ШКОЛЬНІКАЎ...

## або Як захаваць каштоўнасць кнігі для падрастаючага пакалення

**Ці можна захапіць сучасных дзяцей чытаннем? Што залежыць ад бацькоў? Чаму адным цікавыя прыгоды літаратурных герояў, а іншыя пазяхаюць над кніжнымі старонкамі? Ці спрыяе «любові да чытання» школьная праграма па літаратуры? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні шукалі ўдзельнікі круглага стала, які сабраў у грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы педагогаў, псіхолагаў, прадстаўнікоў выдавецтваў і дзіцячых пісьменнікаў.**

### МОЗГ, ЯКІ МЫ НЕ ВЕДАЕМ

Спецыялісты сцвярджаюць, што кожныя 15—20 гадоў фарміруецца новае пакаленне, якое мае свае адметнасці, сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі і погляды на жыццё. Іх аб'ядноўвае агульны культурны код і гістарычны кантэкст. Так, сучасная школа мае справу з пакаленнямі «зумераў» і «альфа». Інфармацыю гэтыя два пакаленні ўспрымаюць і апрацоўваюць па-рознаму, а значыць, трэба пераглядаць падыходы і ў навучанні, і ў стварэнні дзіцячых кніг. А няведанне дзіцячай псіхалогіі і ўзроставых асаблівасцяў дашкольнікаў і школьнікаў прыводзіць да таго, што дзеці не толькі не жадаюць чытаць кнігі, не ўмеюць выкладаць свае думкі, але і ў далейшым з цяжкасцю асвойваюць навучальны матэрыял.

— Мозг чалавека ўладкаваны вельмі складана, і розныя яго зоны «саспяваюць» паступова, — тлумачыць **загадчык кафедры агульнай і медыцынскай псіхалогіі БДУ, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Кацярына БЯСПАНСКАЯ-ПАЎЛЕНКА.** — Так, у мозгу дзіцяці ўжо ў момант яго нараджэння прысутнічаюць 100 млрд нейронаў, кожны з якіх уступае ў тысячы сувязяў з іншымі. І чым больш уражанняў атрымлівае ў маленстве дзіця, тым больш утвараецца ў яго мозгу нейронных сувязяў. Вось чаму вельмі важна, каб у першыя гады жыцця ў малыша было як мага больш яркіх эмоцый ад спазнання навакольнага свету. Гэта падмурак для яго далейшага развіцця...

Сярод экспертаў у галіне нейранавук шырока распаўсюджана гіпотэза, што мозг «зумераў», верагодна, працуе не зусім так, як, напрыклад, мозг іх бацькоў. І пра гэты мозг мы не нічога ведаем... Навукоўцы з універсітэта Кітайскай акадэміі навук у Пекіне лічаць, што прэфрантальная кара, мазжачок і цемянная доля могуць развівацца па-рознаму ў залежнасці ад таго, якія стымулы і ў якой колькасці атрымлівае чалавек. У сваю чаргу, іх амерыканскія калегі ўстанавілі, што мозг тых, хто пастаянна сядзіць, утаропіўшыся ў смартфон, больш актыўна рэагуе на скролінг стужкі ў сацыяльных сетках, чым на чытанне кнігі. Смартфон у руках у паўтарагадовага дзіцяці мяняе яго псіхалогію і ўплывае на кагнітыўнае развіццё. Хутка мы будзем мець новага чалавека, але не будзем ведаць, як з ім размаўляць, як выхоўваць, як перадаваць яму агульначалавечыя і гуманістычныя каштоўнасці. З'явіўся нават новы тэрмін «кіберсацыялізацыя падрастаючага пакалення»...

— А мы прапануем студэнтам педагагічных спецыяльнасцяў састарэлыя схемы, якія ў дзіцячым свеце ўжо не працуюць або працуюць вельмі ўмоўна, — разважае **дацэнт кафедры псіхалогіі адукацыі і развіцця асобы Інстытута псіхалогіі БДПУ, кандыдат псіхалагічных навук Аляксандр ПАЛОННІКАЎ.** — Гэта новая сітуацыя, якая мае непасрэднае дачыненне да чытання. Мы маем справу не толькі са звыклым нам вербальным мысленнем, а з візуальным мысленнем. Заўважу, што гэта іншы спосаб апрацоўкі інфармацыі. Таму метады і прыёмы, якімі мы карыстаемся ў навучальным працэсе, становяцца ўразлівымі і патрабуюць сур'ёзнай рэфлексіі.

Важна не прайсці міма аднаго вельмі важнага феномену. Я звярну ўвагу, што маленькія дзеці, якія выраслі з планшэтам у руках, у сваіх перавагах арыентуюцца на лічбавыя выявы. Змяняецца іх культурны код. Мы праводзілі цікавы эксперымент у мінскай школе. Прасілі дзяцей зрабіць малюнак, а затым пра яго расказаць. Дык вось вербальнае апісанне аказалася для школьнікаў надзвычай складаным. Адбываюцца культурныя змяненні, да якіх наша педагагічная палітыка не падрыхтаваная...

Пакаленне Z — гэта пакаленне візуалаў, якія патрабуюць «закончанага сюжэта» і высокай дынамікі ў ходзе яго развіцця. Кантактуюць і спажываюць інфармацыю яны пры дапамозе кароткіх відэа, тэгаў і мемаў. Дзеці, якія выраслі ў эпоху высокіх тэхналогій, па-іншаму глядзяць на свет. Іх успрыманне — не паслядоўнае і не тэкставае, усю інфармацыю яны ўспрымаюць па прынцыпе кліпа, аддаюць перавагу графічнаму малюнку перад тэкстам.

Калі прапанаваць сучаснаму дзіцяці доўгі тэкст без карцінак, то ён проста ператоміцца, паколькі прывык да кароткіх урыўкаў, з музыкай і тэкстамі. Такое мысленне — гэта адказ на ўзрослую колькасць інфармацыі, якую трэба неяк «пераварыць» за кароткі час.

### ЗНАЙСЦІ «ЗАЛАТУЮ СЯРЭДЗІНУ»

Старэйшае пакаленне прыгадвае, што раней школьнікі пісалі шмат пераказаў і сачыненняў, чаго няма ў сучаснай школе.

— З гэтага навучальнага года было прынята рашэнне значна павялічыць колькасць сачыненняў, пачынаючы з пятага класа і далей ва ўсіх паралелях. Практыкуюцца і навучальныя, і кантрольныя сачыненні, але праблема не ў іх колькасці, а ва ўспрыманні тэксту, — падкрэслівае **начальнік упраўлення маніторынгу якасці адукацыі, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ.** — Трэба не проста прывучаць да чытання, а выхоўваць удумлівага чытача. Чытанне павінна быць асэнсаваным.



Што датычыцца ілюстрацый у кнігах, то, на думку педагога, у пэўным узросце яны становяцца перашкодай для ўспрымання тэксту, таму што ў вучняў фарміруюцца шаблонныя вобразы. Сучасныя дзеці не ўмеюць пераводзіць тэкставую інфармацыю ў візуальную і наадварот. «Спытайце ў вучня, як можа выглядаць літаратурны герой. Ён стане апісваць вам убачанае на ілюстрацыі, нават не спрабуючы ўключыць сваю фантазію, таму ў ілюстраванні кніг павінна быць «залатая сярэдзіна», асабліва з улікам узроставай катэгорыі, на якую разлічаны той ці іншы твор», — падкрэслівае Вячаслаў Караткевіч.

Ва ўсім свеце педагогі канстатуюць, што чытанне сёння адыходзіць на другі план і прайграе іншым спосабам баўлення часу. Ёсць і такое меркаванне, што чытанне больш актуальнае для краін з менш развітой эканомікай. Паводле міжнароднага даследавання, спіс краін, дзе шмат чытаюць, узначальвае Індыя: яе жыхары выдаткоўваюць на чытанне 10 гадзін 42 хвіліны ў тыдзень. Японцы, напрыклад, выдаткоўваюць на гэта 4 гадзіны 6 хвілін. Між іншым, японскія даследчыкі сцвярджаюць, што чытанне кніг вядзе да развіцця галаўнога мозгу і дапамагае чалавеку адаптавацца ў свеце.

Таксама сур'ёзныя міжнародныя даследаванні сведчаць, што непапулярнасць чытання як баўлення часу і чытанне толькі дзеля чытання — так званае неасэнсаванае чытанне — вядуць да эмацыянальнай неінтэлектуальнасці.

### НЕДАХОПЫ ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ

Для таго каб далучыць дзяцей да чытання, вельмі важнае значэнне мае прыклад бацькоў і сумеснае чытанне. **«Нашы дзеці нас не слухаюць, яны нас пераймаюць», — кажуць педагогі.** У сем'ях, дзе дзяцей выхоўваюць тэлевізар і планшэт, а бацькі не вылазяць з сацсетак, пра любоў да літаратуры казаць не даводзіцца. Між іншым, нават проста наяўнасць у сям'і бібліятэкі ўжо ўзнімае рэйтынг вучня. У міжнародным даследаванні PISA гэты фактар напрамую звязаны з паспяховасцю вучня абсалютна па ўсіх відах адукаванасці: матэматычнай, прыродазнаўчанавуковай і чытацкай.

— Чытанне кніг, асабліва разам з бацькамі ў маленстве, развівае ў дзіцяці эмацыянальны інтэлект, уменне разумець свае і чужыя эмоцыі, — падкрэслівае псіхолаг Кацярына Бяспанская-Паўленка. — Бацькі могуць задаваць дзецям пытанні: "Чаму герой так паступіў?», «Якія могуць быць наступствы ў яго ўчынку?» і іншыя. Гэта вучыць іх суперажыванню і аналізу розных сітуацый. Вельмі важна не проста чытаць кніжку разам з дзіцем, а размаўляць з ім, задаваць пытанні, каб убачыць, якое ўражанне засталося ад чытання.

— Кніга — гістарычная з'ява. Для старэйшага пакалення яна адкрывала шырокія гарызонты, нават калі была вышэйшай за наш узровень разумення тэксту, была крышачку навырост. А сёння акном у свет з'яўляецца не толькі кніга, — разважае Аляксандр Палоннікаў. — Усю школьную праграму па літаратуры можна знайсці ў аўдыяфармаце. І калі дзіця не хоча чытаць, яно знойдзе спосаб, як падмануць школу. Многія ставяцца да чытання як да бессэнсоўнага марнавання часу. Дастаеўскі — зусім не актуальны для сучасных школьнікаў. Яны не разумеюць тую рэчаіснасць, паняцці і прадметы, якія згадваюцца ў тэксце. Гэта насамрэч найскладанейшы тэкст з вялікай колькасцю адсылак культуралагічнага плана. Такім чынам школа сама адштурхоўвае вучняў ад чытання.

Дзеці з вялікімі цяжкасцямі вучаць на памяць вершы са школьнай праграмы. А чаму б ім не даць магчымасць самім выбраць верш?

Усіх цікавіць, а як жа фарміруецца школьная праграма па літаратуры і праграма для пазакласнага чытання?

— Творы, якія ўключаюцца ў пазакласнае і асноўнае чытанне, праходзяць сур'ёзны адбор, — запэўнівае Вячаслаў Караткевіч. — Па-першае, пад увагу бярэцца літаратурная значнасць твора: ён павінен быць папулярным, мець літаратурна-крытычную ацэнку, быць моўна дасканалым. Самы важны, на мой погляд, крытэрый — гэта праверанасць часам. Напісаны нядаўна твор адназначна не можа быць уключаны ў школьную праграму. Да таго ж твор павінен быць рэпрэзэнтатыўны для творчасці пісьменніка, які вывучаецца ў школе. Яшчэ адзін крытэрый — даступнасць для ўспрымання. Бяруцца пад увагу і культурныя традыцыі. Так, для беларускіх школ заўсёды будзе актуальнае ўключэнне ў праграму твораў ваеннай тэматыкі. Да адбору твораў для школьнай праграмы па літаратуры прыцягваюцца спецыялісты ў галіне педагогікі, літаратуразнаўцы, настаўнікі. Абавязкова прыслухоўваемся мы і да меркавання членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

### ДУМАЦЬ, ЯК ДЗІЦЯ

Дык усё ж такі якой літаратурай можна зачапіць увагу сучасных дзяцей, асабліва падлеткаў? Таму што сярод наведвальнікаў дзіцячых бібліятэк сёння пераважаюць навучэнцы малодшых класаў...

— Кожны пісьменнік павінен імкнуцца стварыць казачны ўтульны свет, у якім проста захочацца застацца, свет з героямі, якіх хочацца пераймаць, і тады кніжка будзе запатрабаванай і не застанецца ляжаць на паліцы, — дзеліцца сваімі думкамі **дзіцячая пісьменніца Святлана БАХНОВА.**

**Дацэнт кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі факультэта дашкольнай адукацыі БДПУ Людміла ФІНЬКЕВІЧ** лічыць, што, па-першае, дзіця павінна разумець, пра што напісана ў кнізе, а па-другое, на старонках кнігі павінны прысутнічаць знаёмыя яму вобразы. Да таго ж у гісторыях для дзяцей важна выкарыстоўваць гумар, бо яны любяць яго гэтак жа, як і дарослыя. Маленькія чытачы вучацца дыферэнцыраваць камічнае і трагікамічнае. **Дзіцячая пісьменніца Ірына ТОКАРАВА** дадала, што аўтар, які піша для дзяцей, павінен думаць як дзіця.

Што датычыцца падлеткавага ўзросту, то, як заўважыла Людміла Фінькевіч, тут крыху іншыя арыенціры. Падлеткаў хвалююць адносіны паміж хлопцамі і дзяўчатамі, зносіны з равеснікамі і бацькамі, сяброўства, каханне, жыццё, смерць... У літаратуры яны шукаюць адказы на пытанні і сітуацыі, якія ўзнікаюць у рэальным жыцці. Літаратура для іх — люстэрка, у якім яны жадаюць убачыць сябе і разабрацца ў сабе. А пакуль дзіця не зачапіла, размовы аб тым, што «трэба любіць кнігу», што «кніга крыніца ведаў», зусім бескарысныя.

Як правіла, у падлеткавым узросце ўжо адбываецца дыферэнцыяцыя чытацкіх прыхільнасцяў. Хтосьці цікавіцца гістарычнай літаратурай, іншых прываблівае прыгодніцкі жанр, фэнтэзі, псіхалагічная літаратура... Вось толькі Вячаслаў Караткевіч папярэджвае: «Апошнім часам мастацкая літаратура саступае месца навукова-папулярнай. Мы, дарослыя, самі выбіраем яе ў падарунак дзецям. Але, адмаўляючыся ад мастацкай літаратуры, мы тым самым збядняем эмацыянальную сферу чалавека».

Цяжка не пагадзіцца і з той думкай, што настаўнік павінен сачыць за тым, як сёння развіваюцца паэзія, проза, драматургія, якія новыя імёны з'яўляюцца ў літаратуры. А калі настаўнік сам не чытае, нічым не цікавіцца і не ходзіць у бібліятэку, то як ён можа заахвоціць да гэтага дзяцей?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Пэўны час таму група вучоных, у якую ўвайшлі антраполагі, сацыяльныя псіхолагі, культуролагі і лінгвісты, запусціла маштабны міжнародны праект iGen Project, мэтай якога было з першых вуснаў высветліць, як бачыць сябе пакаленне Z. Былі закрануты самыя розныя аспекты: ад карыстання гаджэтамі да цяжкасцяў у зносінах з бацькамі. Аднак ці не самую нечаканую выснову зрабіла Эмілі Уінтэр, даследчыца з брытанскага Універсітэта Ланкастэра. Паводле яе назіранняў, сучасныя падлеткі карыстаюцца бібліятэкамі зусім не так, як рабілі гэта іх папярэднікі. Канцэпцыя «кніжнай кладоўкі» як ціхага адасобленага месца, дзе ўсё прасякнута дысцыплінай і духам акадэмічных дасягненняў, відавочна, састарэлая. «Зумеры» разглядаюць бібліятэкі, хутчэй, як ажыўленыя каворкінгі, куды можна прыйсці вялікай кампаніяй, каб разам з аднакласнікамі зрабіць хатняе заданне і проста абмеркаваць апошнія навіны. Або пасядзець у мяккім крэсле з ноўтбукам у адзіноце, але пры гэтым у асяроддзі іншых людзей. Менавіта такімі магчымасцямі сёння варта спрабаваць прыцягнуць юнае пакаленне ў бібліятэку, а зусім не шыканнем і заявамі ў духу: «Маладыя людзі, у нас тут нельга размаўляць!»

Год міру і стварэння

# ЗВАРОТ ДА ПАМЯЦІ

## Мы жывём па запаветах продкаў, часам нават не здагадваючыся пра гэта

**— ДУХ творчасці ў народа існаваў, існуе і, я перакананы, будзе існаваць. Без гэтага няма адчування паўнаты жыцця, — заўважае дырэктар музея стражытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Барыс ЛАЗУКА.**
**Мы разглядаем вітрыны з побытавымі рэчамі, звяртаем увагу на сальнічку, якую вясковы майстар выразаў з дрэва ў выглядзе качкі...**

***— А ці не абдзелены сучасныя дзеці: усё ж раней малыя раслі ў асяроддзі, дзе падобныя рэчы ствараліся рукамі тых, хто быў з імі побач?** — асцярожна цікаўлюся ў Барыса Андрэевіча.*

— Сапраўды, гэта праблема, але я не хацеў бы абагульняць і катэгарычна заяўляць, што мы ўсё страцілі. Трэба разумець, што мы жывём у атачэнні іншых з'яў, прадметаў, рэчаў, ладу жыцця. У нас пачынае дамінаваць гарадская, а не вясковая культура. Хоць для беларусаў вясковае жыццё заўсёды было на першым месцы. Раней нават арыстакратычныя маёнткі знаходзіліся не ў гарадскім, а ў прыродным асяроддзі, паблізу тых фальваркаў, дзе жыло простае насельніцтва, вырошчваўся ўраджай. Можна згадаць і пра звычай, які атрымаў назву «дзядзькаванне», калі дзяўчынку з багатай сям'і разам з ахмістрыняй, якая яе апякала, а хлопчыка — з камердынерам, звычайна вайсковым чалавекам, адпраўлялі ў сельскія сем'і. І хлапчук, нягледзячы на тое, што ў сталым узросце будзе гаспадаром рознага дабра, якое ацэняць у мільёны, павінен быў ведаць першааснову. Яго маглі пакласці спаць на саломе, на лаве, ён гуляў у тыя ж гульні, што і вясковыя дзеці, спасцігаў асновы сялянскага побыту. Але цывілізацыя развіваецца па сваіх законах. Традыцыйную культуру, народную, ці звязаную з жыццём арыстакратыі, нельга проста ўзяць, рэаніміраваць і тое, што адбывалася ў XVIII—XIX стагоддзях, прыўнесці ў наша жыццё. І тут ёсць небяспека забыцця. Палітыка дзяржавы якраз накіравана на тое, каб захаваць традыцыйную народную культуру. Важна, каб яна арганічна, цэльна ўваходзіла ў сучасную сістэму каштоўнасцяў. Тут ёсць мноства праблем. Традыцыйныя строі не пабачыш акрамя як на фестывалях і святах народнай культуры. Але цяжка ўявіць, што людзі, апранутыя ў падобныя ўборы, з'явяцца, напрыклад, у метро ці офісе. Гэта будзе выглядаць ненатуральна, штучна.

***— Як зрабіць, каб інфармацыя, якую мы «счытываем» у музейных вітрынах, працах вучоных, уваходзіла ў наша паўсядзённае жыццё?***

— Тут можна адзначыць традыцыю абвяшчэння года пад пэўным дэвізам, дзякуючы чаму робіцца вялікая справа. Абвяшчэнне пэўнай тэмы фарміруе аўру, уплывае на падзеі, якія адбываюцца не толькі ў сферы культуры, але і грамадска-палітычнай. І галоўным дэвізам у кожны з такіх гадоў становіцца зварот да памяці. Людзі пачалі шукаць адказы на пытанні, што такое «малая радзіма», «гістарычная памяць»? Напрыклад, мінулы год падвёў нас да таго, каб мы задумаліся пра падзеі, якія адбываліся і ў старажытнасці, і ў XIX стагоддзі, і ў савецкія часы. Глядзіце, як вырасла цікавасць да беларускіх арнаментаў, да сімволікі, няхай і прыдуманай у наш час, якой надзяляюць тыя ці іншыя элементы.

***— Але калі б не гэтае новае «прачытанне» сучаснікамі народных узораў, можа, такой цікавасці да народнага касцюма і не ўзнікла б?***

**«Нельга выхаваць грамадзяніна, працаўніка, выдатнага інжынера ці педагога з чалавека, які жыве без такой памяці, без думак: а што скажуць пра мяне людзі. Вось яно, адчуванне міру і ладу. І ў гэтым годзе мы павінны стаяць за тое, каб мір быў ва ўсім — нашым жыцці, поглядах, эмоцыях, пачуццях. На жаль, з развіццём новых тэхналогій паступова нам прывіваюцца нейкія іншыя каштоўнасці. Праз розныя элементы — адзенне, вечарынкі, фільмы. Часам за прыгожай абгорткай мы атрымліваем і вельмі небяспечныя пасылы».**





— Так, ён існаваў бы толькі ў музейных экспазіцыях, на фестывалях, рэканструкцыях народных свят. Больш за тое, калі ў грамадства не будзе шанавання помнікаў народнай культуры, яны будуць разглядацца як нешта аджытае, непатрэбнае, што можна выкінуць, знішчыць. Але калі на рэчы завязана памяць аб матулі, дзядулі, бацьку ці дзядзьку, якія яе рабілі, гэта ўспрымаецца зусім інакш. Я хачу звярнуцца да чытачоў «Звязды»: падумайце, паспрабуйце згадаць, ці існуюць у свеце яшчэ краіны, у якіх дзяржаўным святам з'яўляецца дзень шанавання продкаў? Людзі прыбіраюць магілкі, успамінаюць памерлых. Для беларусаў Радаўніца — абавязковая паездка на магілы продкаў, якімі б ні былі складанымі матэрыяльныя ці іншыя ўмовы. Гады, якія праходзяць пад пэўнымі дэвізамі, я перакананы, кансалідуюць нацыю ў культурным кантэксце, у культурнай памяці. Год міру і стварэння ўпісваецца ў гэту традыцыю. Памяць і зварот да жыцця продкаў, шанавання каштоўнасцяў, якімі яны жылі, аб'ядноўваюць нацыю. А што для беларусаў заўсёды было галоўным: мір і лад у сям'і, паміж бацькамі і дзецьмі, старэйшым і маладым пакаленнямі, паміж суседзямі, мір на нашай зямлі. Паспрабуйце згадаць з урокаў гісторыі, ці праяўляла калі-небудзь Беларусь нейкую варожасць у адносінах да іншых народаў? Не знойдзеце такіх прыкладаў.

***— Калі чалавек аздабляе сваё жыццё прыгожымі рэчамі, выбірае самыя маляўнічыя куткі для пабудовы сядзіб і палацаў, разбівае каля іх цудоўныя паркі і кветнікі, сваім дзецям з маленства прывівае любоў да зямлі, ці могуць у яго нашчадкаў узнікаць іншыя думкі, акрамя як падымаць свой край і рабіць яго прыгажэйшым?***

— Разважаючы з пазіцыі вучонага, які займаецца вывучэннем матэрыяльнай культуры, у тым ліку арыстакратыі, помнікамі сакральнага мастацтва, хачу сказаць, што не ведаю прыкладаў, калі б у нейкіх помніках, у касцюмах, тканінах, побытавых рэчах нашых продкаў праяўляліся вобразы і сімвалы адмоўнага. Сялянскае жыццё ўвогуле не вымагала людзей займацца вайсковай справай. Гэта была выключна мірная, стваральная праца. У арыстакратычным асяроддзі існавала пэўная доля ўсведамлення, што мужчыну родам заклікана заступіцца за слабага. Калі мы глядзім на народныя касцюмы, перад намі паўстаюць вобразы цнатлівай дзяўчыны, годнай кабеты, мужчыны, які дбае пра згоду ў сям'і, пра дастатак. А возьмем арыстакратычны касцюм. Перад намі будзе мужчына-заступнік, які аберагае свой род, сваіх бацькоў і дзяцей, сваю жонку, наогул усіх жанчын. Успомніце касцюм, у якім адкідныя рукавы закідваліся на плечы (так званыя «вылёты»). На поясе вісела шабля. На галаўным уборы магла быць каштоўная брошка, прышпільвалася сакалінае пяро. Павязваўся слуцкі пояс. А цяпер уявіце, як такі чалавек выглядаў у паланэзе, калі кланяўся жанчыне, цалаваў ёй руку. Вось ён нахіляецца да жанчыны, рукавы і канцы пояса апускаюцца долу і нават пяро на шапцы кланяецца жанчыне. Арыстакраткі былі вартыя сваіх мужоў, бацькоў. Калі мужчыны былі на вайне, выступалі ў ролі заступнікаў сваёй дзяржавы, жанчыны дакладвалі ім пра справы ў гаспадарцы, пісалі, якім варта заняцца рамонтам. Яны не толькі клапаціліся пра сваіх дзяцей, але і дбалі пра будучыню. Пасля маглі ісці радкі пра тое, як жанчыне не хапае падтрымкі мужа, яго шчырасці і сілы. Такія ж лісты мы можам пачытаць і ад жанчын 1941—1945 гадоў. Гэта ўласцівасць славян. Роля жанчыны заўсёды была высокай. Нездарма казалі, што мужчына — галава, а жанчына — шыя.

Пачытайце радкі са статутаў ВКЛ. Там асобная група артыкулаў была звязана з абаронай жанчыны і яе дзяцей ад усяго: ад злых людзей, ад вар'ята-мужа, ад незразумела трактаванага закона. Была тая частка маёмасці, якая перадавалася жанчыне як пасаг. І яе муж не меў права на гэта пасягнуць. У нас зараз існуе так званы мацярынскі капітал. Але яшчэ ў XVI—XVIII стагоддзях існавала паняцце мацярызны — якраз таго капіталу, які жанчына прынесла ў новую сям'ю, і толькі яна магла яго перадаць сваім дзецям. А мы нават не задумваемся, што жывём тымі ж каштоўнасцямі.

***— Атрымліваецца, культура з'яўляецца падмуркам для развіцця грамадства?***

— Паглядзіце на нашы традыцыі этыкету, як мы сябе паводзім, на што арыентуемся. Часам бабуля ўшчувае непаслухмяных унукаў: «Бачыў бы вас дзед». Гэта пасыл да нашых продкаў, асуджэнне ад іх і ад суседзяў — найвышэйшы суд. Этыкет — таксама частка нашай памяці. Яе нельга прывіць прышчэпкай ці лозунгам. Гэта павінна быць у ладзе жыцця. На святочны калядны стол мы кладзём сена ці салому — тое, што вырасла на лузе, было сабрана працавітымі людзьмі. У такія дзеянні нашы продкі закладвалі глыбокі сэнс. На свята мы наліваем кілішак гарэлкі і кладзём на яго лустачку хлеба — для нашых прашчураў, якія назіраюць за намі. Гэта зноў памяць пра мінулае, і яна арганічна ўваходзіць у наша жыццё. Нельга выхаваць грамадзяніна, працаўніка, выдатнага інжынера ці педагога з чалавека, які жыве без такой памяці, без думак: а што скажуць пра мяне людзі. Вось яно, адчуванне міру і ладу. І ў гэтым годзе мы павінны стаяць за тое, каб мір быў ва ўсім — нашым жыцці, поглядах, эмоцыях, пачуццях. На жаль, з развіццём новых тэхналогій паступова нам прывіваюцца нейкія іншыя каштоўнасці. Праз розныя элементы — адзенне, вечарынкі, фільмы. Часам за прыгожай абгорткай мы атрымліваем і вельмі небяспечныя пасылы. Многія фільмы і рэчы прапагандуюць культ насілля. Мы, як вучоныя, займаемся і пытаннямі культурнай бяспекі. Проста забаронай на пэўныя фільмы і з'явы тут нічога не вырашыш. Мы павінны фарміраваць у нацыі той ген, той антывірус, які будзе выстаўляць заслону адмоўнаму ўплыву.

***— Традыцыйная культура, дзе з кожным абрадам праз пакаленні перадаваліся пэўныя ідэі, каштоўнасці, можа фарміраваць такі імунітэт? Магчыма, яшчэ ў дзіцячым садку пры знаёмстве малых з абрадамі, рамёствамі, арнаментамі можна вучыць іх разважаць, выбіраць: што добра, а што — дрэнна?***

— Так, і вывучэнне традыцый — гэта незвычайна шырокі абсяг для спазнання. Напрыклад, чаму ў нас у такой пашане ручнік? Гэта не толькі побытавая рэч, каб выціраць рукі і твар — ён выконвае многа розных функцый, выкарыстоўваецца ў абрадах. Чаму не проста тканінай, а ручніком упрыгожвалі выяву Маці Божай і святых? Чаму самае дарагое, хлеб і соль, неслі на ручніку? Чаму ручнік з'яўляўся ўвасабленнем здольнасці, годнасці, вартасці маладой дзяўчыны, якая выходзіла замуж, паказвала, як умее ткаць і вышываць? Хіба не цікава знаходзіць адказы на гэтыя пытанні? Ва ўсім закладваліся добрыя ідэі. Тую ж папараць-кветку на Купалле шукалі дзеля шчасця, дзеля міру, дзеля згоды. Увесь лад жыцця быццам падводзіў чалавека да засваення памяці. Дзеці бачылі, як бацькі працавалі і сустракалі святы, і разумелі, што ім таксама трэба так рабіць. Нашы продкі фарміравалі і назапашвалі памяць, якая перадавалася ў звычаях, абрадах, казках, песнях, матэрыяльных формах.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# «ВЕЧНАЯ СІЛА НЕБА І МУЖНАСЦЬ НАШАГА ВОІНА-РАТНІКА НЕ ПАДВЯДУЦЬ»

## 500 гадоў «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага




**500 гадоў таму з'явіўся твор, які стаў знакавым для беларускай літаратуры. Хоць напісаны ён быў на лаціне і да таго ж далёка ад Беларусі, у Рыме. Але аўтар напісаў пра нашу з вамі зямлю з такой любоўю, з такой верай у яе людзей... Пра Дняпро, пра Белавежскую пушчу, пра белыя хусткі жнеек, пра волата-зубра, паміж рагоў якога могуць сесці тры дужыя воі... Цалкам назва гучыць так: «Carmen de statura feritate ac venatione bisontis», альбо «Песня пра моц, дзікасць зубра і паляванне на яго». А мы ведаем гэты шэдэўр часоў Рэнесансу як «Песню пра зубра», напісаную беларусам Міколам Гусоўскім. І вось вам пяць цікавых фактаў...**

### 1. Задума ўзнікла падчас карыды

Менавіта ў Рыме, куды Мікола Гусоўскі патрапіў у якасці сакратара біскупа Эразма Вітэлія, і нарадзілася паэма... Вітэлій адправіўся ў Рым як пасол, спадзеючыся ўгаварыць папу рымскага Льва Х на альянс супраць Асманскай імперыі і татар, ад набегаў якіх пакутавалі Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае. Ёсць версія, што ў атачэнне біскупа Гусоўскі трапіў, калі выратаваў яго жыццё падчас палявання. Ён жа піша ў сваёй паэме, што бацька быў лоўчым, і майстэрству палявання вучыў сына з маленства:

*Змалку ад бацькі вучыўся*
*ў бясконцых абходах*
*Крокам нячутным ступаць,*
*каб нішто не шурхнула...*
*Колькі патоў ён, бывала,*
*зганяў з мяне ў зімнюю сцюжу,*
*Коп'і шыбаць, прымушаючы ў бегу*
*наводмаш!*
*Колькі нагледзеўся смерці,*
*наслухаўся енку*
*У пушчах, пакуль мяне, сына,*
*вучыў палясоўшчык.*

Амаль усё, што мы ведаем пра Міколу Гусоўскага, узятае з яго твораў. Вось як апісвае ён сам з'яўленне паэмы:

*Неяк у Рыме пры сціжме*
*людзей незлічонай*
*Сведкам мімовольным быў я —*
*бою быкоў на арэне.*
*Люд пацяшаўся, гудзелі, як вулей,*
*трыбуны,*
*Стрэлы ж і коп'і ўпіваліся*
*ў цела жывёлін,*
*Боль прычыняючы ім невыносны.*
*Пакуль мы глядзелі,*
*Як вар'яцеюць быкі*
*і як бліскае ярасць*
*З позіркаў раненых,*
*гул выклікаючы ў цырку, —*
*Хтосьці сказаў: «Як у нас*
*на зубрынай аблаве».*
*Я пагадзіўся і там жа*
*ў сваім асяроддзі*
*Усё расказаў, што і ў нас*
*у змаганні зацятым*
*Гэткім жа чынам адольваюць*
*дужага звера.*
*Як і гаворыцца ў прыказцы мудрай,*
*язык мой*
*Мой жа быў вораг.*
*Праслухаўшы ўсё ў захапленні,*
*Мне загадалі адразу ж узяцца*
*за працу,*
*Каб успаміны свае,*
*пераліўшы ў памер вершаваны,*
*Песняй зрабіць і пра нас,*
*і пра нашы аблавы.*

Можна ўявіць: натоўп у Калізеі, быкі, тарэадоры, жарсці палаюць... А Гусоўскі панам заяўляе: а ў нас на радзіме яшчэ магутнейшыя быкі маюцца, куды там вашым! Італьянцаў належала зацікавіць далёкай зямлёй, адкуль прыехалі госці па дапамогу. Вось беларускі зубр і стаў нашым галоўным брэндам яшчэ ў шаснаццатым стагоддзі!

### 2. Паэма мусіла быць дапаўненнем да чучала зубра

*Бачыце, я, між паэтаў*
*часовы абраннік,*
*Вымушан скласці свой спеў*
*аб краіне з багаццем*
*Свету жывёльнага ў ёй,*
*бо і звер гэты цудам*
*Толькі шчэ ў нас захаваўся*
*пад зоркай Палярнай.*

Але паэма, якая мусіла выклікаць у рымскай арыстакратыі цікавасць да зямлі з пушчамі і магутнымі зубрамі, насамрэч была толькі дадаткам да самага адметнага падарунка. А ім мусіла стаць набітая сенам скура зубра, якую павінен быў адаслаць у Рым Мікалай Радзівіл. Сапраўды, што тыя словы, калі чучала можна памацаць, аглядзець на свае вочы!

Мікола Гусоўскі пісаў у прадмове да паэмы, што біскуп «адаслаў лісты Радзівілу, ваяводу віленскаму, просячы падшукаць скуру найвялікшага звера гэтай пароды, а мне, у той час свайму дарадцу, загадаў напісаць што-небудзь аб прыродзе і паляванні на звера, жадаючы паказаць папу постаць зубра не толькі ў рэчах, але і ў словах».




### 3. Твор памяняў спонсараў з-за чумы

*Гаспадары пажадалі*
*пачуць гэту песню.*
*Ну, а калі атрымаў даручэнне —*
*старайся!*

Паэма атрымалася эпічнай... На лацінскай мове яна была напісана, зразумела, чаму: міжнародная мова навукі і мастацтва, якая мусіла дадаткова пацвердзіць, што ў далёкай ліцвінскай зямлі жывуць людзі абазнаныя і таленавітыя. Узорам мудрага ўладара быў выведзены князь Вітаўт.

Зразумела, аўтар разлічваў, што яго працу высока ацэняць і чакае шчодрая ўзнагарода... Але ўсё перакрэсліла чума.

У Рыме больш не ўчынялі бліскучых тлумных відовішчаў. Людзі паміралі дамамі, вуліцамі... Іх не паспявалі хаваць, і целы кідалі ў Тыбр. Дагнала чума і вучонага папу рымскага Льва Х. Памёр і апякун Гусоўскага, біскуп Эразм Вітэлій, які вось-вось мусіў стаць кардыналам.

З застрашлівымі падрабязнасцямі апісаў Гусоўскі чуму ў вершы, прысвечаным святому Себасцьяну: *«Вось моравае паветра скіроўвае сваю лютасць на ўцякаючых гараджанаў і заганяе ў труны тое, што яшчэ засталося. Пад уладай хваробы не хапіла б месца ў ямах і канавах для нашых целаў, калі б упалых не зносіў у марскія хвалі Тыбр. Бачу смярдзючых лісаў, якія ў вінаградніках грызуць целы нямоглых, скрыгочучы па костках крывымі зубамі. Пра што я хачу казаць? Пра жыраванне здзічэлых псоў, ці спажыву птушак? Але тут можна ўбачыць тысячы іншых жахаў... Гарадскія ўлады паўлічваюць пакуты паміраючага, бо не дазволена аддаць доўг бязлітаснага лёсу, мёртвы прыносіць шкоду жывым. Дом у жалобе зачыняецца і забараняецца выходзіць з яго, толькі ў высокія вокны можна паклясці сціплы харч. І таму бацька заціскае рот паміраючаму сыну, каб не пачулі стогн, верная жонка, абліваючыся слязамі, адвяртае галаву мужа».*

Гусоўскі ацалеў. Але давялося вяртацца на радзіму, шукаць іншых апекуноў... Нейкі час ён прысвячае свае творы біскупу Яну Карнкоўскаму, з якім яго звязваюць даволі прыязныя адносіны. Але гонар паэта — «Песня пра зубра» — заставалася незапатрабаванай, неацэненай... І аднойчы Гусоўскі здымае з яе прысвячэнне папу і піша прысвячэнне сакратару каралевы Боны Сфорца Людовіку Альфію, у якім заклікае яго перадаць паэму каралеве.

*О, Людавік, гэту сціплую кніжку*
*табе давяраю*
*З просьбай пранікнуць у сутнасць*
*і глыб яе зместу,*
*А на выпадак, калі ў ёй нічога*
*не ўгледзіш,*
*Што далікатнейшы слых Каралевы*
*магло б улагодзіць,*
*Хай яна сыдзе за сціплы табе*
*мой дарунак.*

Далей ідзе вялікі зварот да каралевы, у якім паэт апісвае гісторыю ўзнікнення паэмы і сціпла дадае: «Застаецца толькі невялікі твор, напісаны тады мною спехам (мне не ставала ні часу, ні здольнасці)».

*«Гэтае пісанне хачу я паднесці табе замест сціплага падарунка, спадзеючыся, што надарыцца выпадак, калі яго Каралеўская Вялікасць па сваім звычаі адправіцца на паляванне, і гэтая кніжка, што змяшчае лясныя прыгоды, цябе зацікавіць і ты яе прачытаеш. Гэтым самым жадаю я не так палепшыць сваё становішча, як праклясці шлях вучоным мужам, каб і яны табе свае творы паднеслі. І каб ты, найвучонейшая княгіня, узважыла іх здольнасці і параіла свайму яснавяльможнаму мужу, які абавязаны больш мець часу для вядзення войнаў, чым для чытання кніг, тых, каго палічыш найбольш таленавітымі».*

Паэт не памыліўся: большасць даследчыкаў лічыць, што менавіта на сродкі каралевы Боны і была ў 1523 годзе выдадзеная кніга, у якую ўвайшла «Песнь пра зубра».

### 4. Гусоўскі напісаў не толькі пра зубра, але і пра чорнага быка

Як і многія класікі, Мікола Гусоўскі ўспрымаецца як аўтар аднаго твора. Хоць насамрэч захавалася іх, наколькі я ведаю, чатырнаццаць. У зборнік з «Песняй пра зубра» ўвайшло яшчэ 11 рымскіх вершаў. Сярод іх — «Суцяшэнне», дзе аўтар звяртаецца да свайго апекуна Эразма Вітэлія, які даведаўся, што супраць яго інтрыгуюць зайздроснікі: «Што табе гэтыя перасуды, калі тваё сумленне чыстае? Хто можа нешта зрабіць супроць таго, чаго хоча сам Бог?»

Чатыры вершы прысвечаны эпідэміі... Адзін з іх асабліва адметны — «На ахвяраванне чорнага быка, учыненае прылюдна ў Рыме нейкім грэкам супроць эпідэміі чумы». Верш з'явіўся з-за рэальнай падзеі: напалоханыя людзі ў адчаі пачалі звяртацца да паганскіх традыцый. Гусоўскі абураецца, што ў Вечным горадзе, дзе столькі хрысціянскіх святых, адбываецца паганскае ахвяраапрынашэнне.

*Ты, вераломны, на добры,*
*саспелы ўраджай не зважаеш,*
*Рукі не хочуць твае*
*поўнае жніва ўчыніць.*
*Хіба ты ў страху нікчэмным*
*ад марнай чумы так сумеўся,*
*Што ўжо праз чорных быкоў*
*моліш падземных пачвар?*

У вершы «Малітва да св. Ганны» Гусоўскі зноў згадвае таго няшчаснага чорнага быка: «Горад Рым напалоханы страшным знакам, аплакваючы жалобныя хаўтуры баязлівага плебсу, складае ў ахвяру чорных быкоў з падпаленымі рагамі і ўстрывожана просіць палёгкі ў няшчасці».

У вершы «Пра чутку, якая нечакана ўзнікла ў касцёле Сан Ларэнца ін Дамаза» апісваецца цуд: у разгар чумы, у спёку ў адным з рымскіх храмаў была ўбачаная пакрытая потам статуя Хрыста. Згадаем яшчэ паэму «Жыццё і дзеі Святога Гіяцынта», напісаную падчас кананізацыі гэтага святога, якая адбывалася ў 1523—1524 гг., і паэму «Новая і дзіўосная перамога над туркамі ў месяцы ліпені», надрукаваную ў 1524 годзе.

### 5. Пераклады істотна адрозніваліся ад арыгінала

Пра паэму Міколы Гусоўскага загаварылі толькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. У 1805 годзе было надрукавана 100 яе асобнікаў у гонар 50-годдзя Маскоўскага таварыства даследчыкаў прыроды. І яшчэ паўтара стагоддзя спатрэбілася, каб твор загучаў на мове той зямлі, на якой нарадзіўся аўтар... У 1969 годзе адбылася публікацыя паэмы ў перакладзе на беларускую мову Язэпа Семяжона ў 6-м нумары часопіса «Полымя». Пераклад Семяжон паэму з дапамогай лацініста Якава Парэцкага, які складаў падрадкоўнік.

Менавіта ў перакладзе Язэпа Семяжона паэма загучала эпічна, вельмі па-беларуску... Вось толькі, на думку даследчыкаў, гэта хутчэй паэтычная адаптацыя, чым пераклад. Семяжон пераўвасабляў вобразы, дапаўняў іх, так, што ледзь не на трэць аб'ёму прырасціў... Змяняў рытм, дапісваў радкі, дэмакратызаваў аўтара, сына лоўчага (пачэсная шляхецкая пасада), якога ператварыў у сына палясоўшчыка. Як вам такія радкі: «Стогне і ў цемрадзі ночы злавесны наш // Вобмацкам долі шукае», «Князь і баяры — усе, каму льга заступіцца, // Глухі да нас і не горай, чым жорсткі татарын, // Душаць пятлёй галасы абурэння ў народзе». Колькі навукоўцаў абапіралася ў высновах на гэтыя радкі! А ў арыгінале, аказваецца, нічога падобнага няма. Перакладчык апраўдваўся: агучваў думкі паэта, якія той не насмельваўся ўвасобіць.

Вядомы лацініст Уладзімір Шатон узяўся выправіць усе адвольнасці папярэднікаў. Пераклаў паэму максімальна блізка да арыгінала, захаваў і колькасць радкоў, і вершаваны памер... Але ў мастацтва свая праўда: пераклад Шатона застаўся мала запатрабаваным. Таму што ў інтэрпрэтацыі Семяжона паэма сапраўды гучыць як шэдэўр. Паводле слоў вядомага даследчыка і пісьменніка Сяргея Кавалёва, Семяжон пераўтварыў забытага паэта-лацініста ў народнага паэта-рапсода, пушчанскага самародка.

Мікола Гусоўскі стварыў вобраз беларуса — чалавека Адраджэння, воіна, паляўнічага, мысляра, якім можна ганарыцца: *«Хоць нам не ўласцівыя ні норавы, ні звычаі старажытныя, аднак вечная сіла неба і мужнасць нашага воіна-ратніка не падвядуць, як справа дойдзе да зброі, калі толькі мы, бяззбройныя, не будзем раздушаны нейкім наканаваным няшчасцем, ці, ясней кажучы, спрытным круцельствам некаторых і сваёй бяздзейнасцю — і гэта, як мне здаецца, нас і звязвае».*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Калинковичский завод бытовой химии» (продавец) извещает о проведении 23 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условие продажи:** инженерные сети (электрические, водопроводные, канализационные), проходящие внутри границ приобретенного участка, являются собственностью ОАО «Калинковичский завод бытовой химии». Их дальнейшее совместное использование, ремонт (включая капитальный), модернизацию, замену, демонтаж, реконструкцию, подсоединение вновь возводимых к существующим новый собственник осуществляет за свой счет по согласованию с ОАО «Калинковичский завод бытовой химии» (или его преемником). Не позднее двухмесячного срока со дня подписания договора купли-продажи новый собственник обязан установить ограждение по границам приобретенного земельного участка | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 333/С-21735** общей площадью **591,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад сырья**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21725**, общей площадью **717,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада с навесом для хранения котельного топлива**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21740**, общей площадью **18,5 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание туалета**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100003006201** общей площадью **0,5760 га (право аренды). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания склада сырья | **115 088,82** | 11 508,88 |

<u>**Продавец:**</u> ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», 247710, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (033) 616-72-16 – Чернявский Эдуард Петрович;** заключение договора купли-продажи по **тел.: 8 (029) 532-70-87 – Логвина Аксана Ивановна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

